Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — р. 90 к. „ 3 „ 2 р. 70 к. „ 6 „ 4 р. — к. „ 1 год 8 р. — к. Змена адрэсу: іншагародзяе — 20 к. мясцовыя — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шапіраграфі пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шапіраграфі паперад тэксту 1 р. — к. За радок шапіраграфі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сялянным на 50 проц. даражэй. Зыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 квадрат — 35 кап. За кожны дадатковы — 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за квадрат — 15 „ За кожны дадатковы — 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, на ўсіх аддаленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пошт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА.

№ 146 (2334) Серада, 27-га чэрвеня 1928 г.

Вынікі ўсесаюзнага зьезду калектыўных гаспадарак.

Усесаюзны зьезд калектыўных гаспадарак адчыніў новую старонку ў гісторыі калектыўна-гаспадарчага руху Савецкага Саюзу. Пастановы гэтага зьезду па асноўных пытаньнях калектыўна-гаспадарчага руху маюць вялізнае практычнае значэньне як для самых калектыўных гаспадарак, так і для кіраўчых органаў, якія вядуць працу ў галіне сельскае гаспадаркі.

Перш ма ўсё зьезд падлічыў вынікі калектыўна-гаспадарчага руху з моманту першае Усесаюзнае нарады калектыўных гаспадарак і па сучасны момант. Зьезд адзначыў, што, дзякуючы мерапрыёмству Савецкае ўлады і партыі ў галіне калектыўна-гаспадарчага будаўніцтва, а таксама дзякуючы актыўнасьці і самадзейнасьці насельніцтва, калектыўна-гаспадарчы рух за апошні час пачаў набываць сапраўдны масавы характар. Узрост ліку калектыўных гаспадарак за апошнія 7 месяцаў амаль што на 25 тысяч адзінак вылучаецца яскравым да таго доказам, рэчым у калектыўна-гаспадарчае будаўніцтва, як правіла, уцягваецца вясковая беднота і незаможніцкія сераднякоўскія пласты вёскі.

Адзначаючы гэты рост калектыўна-гаспадарчага руху, Усесаюзны зьезд разам з тым прызнаў неабходным у далейшым зьвярнуць пільную увагу на якасны бок справы і ў першую чаргу на правільную арганізацыю калектываў. У гэтых адносінах вялізнае значэньне мае вырашэньне такіх пытаньняў, як унутрыгаспадарчае земляўпарадкаваньне калектыўных гаспадарак, правільная арганізацыя працы і капіталаў, больш выгаднае выкарыстаньне тэхнічных дасягнэньняў і палепшаньне агрэтэхнічнае працы.

Трэба проста сказаць, што да гэтае пары ў галіне арганізацыі сельска-гаспадарчае вытворчасьці калектыўных гаспадаркі маюць шмат недахопаў. Найбольш значнымі недахопамі вылучаюцца адсутнасьць належнага парадку гаспадаркі і ў вывязку з гэтым адсутнасьць плянавасьці і ў працы, і затым нерацыянальная арганізацыя працы і пярэстасьць у формах і метадах аплаты гэтае працы.

Зьезд калектыўных гаспадарак прызнаў, сказуоўна, неабходным, пачынаючы з гэтага году, распрацаваць хоць-бы спрошчаныя арганізацыйна-вытворчыя планы для калектыўных гаспадарак і ўстанавіць пэўны напрамак іх гаспадаркі.

У адносінах арганізацыі працы, зьезд выказаўся за такія формы аплаты працы, якія-б стымулявалі ўзьнімаць вытворчасьці і давалі-б магчымасьць правільна выкарыстаць працу ўсіх дадатковых членаў (аплата па вынікасьці і якасьці працы).

Асаблівую ўвагу зьезд аддаў пытаньням арганізацыйна-вытворчага характару паконт формаў і шляхоў саміх калектыўных гаспадарак і іх абслугоўваньня. У прыватнасьці, зьезд адзначыў, што большая частка панава арганізоўваемых калектыўных гаспадарак зьяўляюцца дробнымі аб'яднаньнямі сялянства, якія ня могуць рацыянальна пабудаваць сваю сельска-гаспадарчую вытворчасьць. Таму зьезд рашуча выказаўся за арганізацыю буйных калектыўных гаспадарак як спосабам аб'яднаньня ў іх большае колькасьці гаспадарак, так і спосабам злучэньня існуючых калектываў.

Зьезд падкрэсьліў неабходнасьць паступовага пераводу простых вытворчых таварыстваў у больш вышэйшыя формы калектыўных аб'яднаньняў (у арцелі, сельска-гаспадарчыя камуны) спосабам павялічэньня аграмаджаных капіталаў і сродкаў вытворчасьці і ўзмацненьня матар'яльнае базы ў іх (трактар, складаны інвэнтар, індустрыяльныя ўстаноўкі і інш.). Разьвіцьцё вытворчае чыннасьці, адпаведная падрыхтоўка членаў таварыстваў, паступовае аграмаджаньне працы,—усё гэта будзе ў значнай меры дапамагаць ператварэньню простых вытворчых аб'яднаньняў (таварыстваў па агульнай апрацоўцы зямлі, машына-трактарных, мэліярацыйных таварыстваў і інш.) у вышэйшыя формы сел.-гаспадарчых калектываў.

Ажыцьцяўленьне вышэйпамянёных задач у галіне калектывізацыі сельскае гаспадаркі патрабуе значнага ўзмацненьня агравытворчага абслугоўваньня калектыўных гаспадарак з боку зямельных органаў і сельска-гаспадарчае кааперацыі.

У гэтых адносінах аграмаднае значэньне ў сучасны момант мае арганізацыя аградапамогі калектыўным гаспадаркам. Зьезд пацьвердзіў неабходнасьць узмацненьня аграабслугоўваньня калектыўных гаспадарак з боку аграсеткі зямельных органаў і разам з тым выказаўся за павялічэньне кадраў сваіх аграномаў калектыўна-гаспадарнікаў, якія павінны знаходзіцца на сталай працы ў сыстэме калектыўна-гаспадарчага аб'яднаньня. Пры гэтым неабходна падкрэсьліць, што праца памянёных аграномаў калектыўных гаспадарнікаў павінна праводзіцца пад агульным плянавым кіраўніцтвам зямельных органаў і іх аграпэрсаналу.

Побач з гэтым, адпаведныя арганізацыі павінны значна ўзмацніць сваю працу па дастаўцы калектыўным гаспадаркам сродкаў вытворчасьці па культурна-асьветнай працы, па палепшаньні кватэрных умоў і г. д.

Вось у асноўным галоўныя пастановы ўсесаюзнага зьезду калектыўных гаспадарак. Неабходна, каб на мясцох гэтыя пастановы былі дэтальна вывучаны і каб мясцовыя савецкія органы, кааперацыйныя і інш. грамадзкія арганізацыі зрабілі практычныя вывады з гэтых пастаноў і адпаведна мясцовым умовам узяліся за іх правядзеньне ў жыцьцё.

УРАЧЫСТАСЬЦЬ „ВЕЧНАГА МІРУ“

2-ое падпраўленае выданьне праэкту Келёга.

ВАШЫНГТОН, 25-VI. Дзяржаўны дэпартамант агаласіў тэкст угавору аб забароне вайны, як сродку нацыянальнае палітыкі“ ў новай рэдакцыі, дасланай 14-ці дзяржавам.

Самы тэкст угавору не зьмяніўся, адак, перад тэкстам ёсьць новая прадмова, якая прадугледжвае, што ў выпадку парушэньня ўгавору кім-небудзь з яго ўдзельнікаў, іншыя дзяржавы вызваляюцца ад сваіх абавязацельстваў адносінах да парушыўшага ўгавор. У тэксту ўгавору далучаецца нота з тлумачэньнем, што 6 францускіх агаворак не ўвайшлі ва ўгавор, як непатрэбныя, бо ўгавор сам сабою не пасягае яго ўдзельнікаў права на самаабарону і не супярэчыць лёкарнскім актам статуту Лігі Нацый і ўгаворам аб нейтралітэце.

Французы. Падпісаньне ўгавору чакаецца 14-га ліпеня ў Парыжы (нацыянальнае сьвята захопу Бастыліі) у прысутнасьці Келёга.

ЧЭМБЭРЛЕН НЯ ЗУСІМ ЗАДАВОЛЕН.

ЛЁНДАН, 25-6. Абмяркоўваючы новую ноту Келёга, «Дэйлі Тэлеграф» адзначае, што Келёг зусім не закрануў ангельскіх агаворак адносна Эгіпту, а таксама шэрагу іншых пунктаў. «Зьяўляючыся вопытным дыплёматам, піша газэта,—Келёг прыняў да ведама намёк Чэмбэрлена і застаўся пры сваёй ранейшай думцы».

«Манчэстэр Гардыян» піша, што Келёг ухітрыўся захаваць тэкст свайго праэкту амаль бяз зьмены і ў той-жа час стварыць уражаньне, нібы ён згаджаецца на ўступкі ў адносінах да дзяржаў, заявіўшых агаворкі.

УАНКАРЫСТЫ Ў ЗАХАПЛЕНЬНІ АД «НОВАЕ ЭРЫ».

ПАРЫЖ, 25-6. Францускі друк захоплены ўступкамі, якія Келёг зрабіў

Урагэдыя нямецкіх с.-дэмакратаў

ЦЭНТР І ШТРЭЗЭМАН ДЫКТУЮЦЬ МЮЛЬЛЕРУ СВАЕ ЎМОВЫ.—УРАД ДЗЕЯЧОЎ, НЯ ЗЬВЯЗАНЫХ ФРАКЦ. АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАМІ»

БЭРЛІН, 25-VI. Прэзыдыум парламэнцкай фракцыі партыі цэнтру пастанавіў даць пасаду парляманцкай фракцыі партыі цэнтру выказацца за заснаваньне габінэту з палітычных дзеячоў 4-х партый „вялікае каліцыі“, ня зьвязаных фракцыйнымі абавязацельствамі.

Прэзыдыум парляманцкае фракцыі партыі цэнтру пастанавіў прапанаваць кандыдатуру Вірта на пасаду віцэ-канцлера.

Штрэзэман на запытаньне Мюльлера, ці згодзен ён увайсьці ў склад ураду Вэймарскае кааліцыі, адказаў за сябе і за Куртыюса, адмоўна, а таксама выказаўся за сфармаваньне «габінэту з кіруючых дзеячоў партый вялікае кааліцыі», прычым урадавая праграма павінна быць выпрацавана ня тляхам міжфракцыйных перамоў, а перамоў між гэтымі дзеячамі. Такім чынам, заўтра павінны аднавіцца перамовы аб фармаваньні ўраду вялікае кааліцыі пад новаю шыльдаю—„урад дзеячоў, ня звязаных фракцыйнымі абавязацельствамі“.

Як нямецкія меншавікі „бароняць“ рэвалюцыянэраў.

БЭРЛІН, 23-6. У адказ на пададзеную фракцыяй прускага ляндтагу прапанову аб агульнай амністыі, якая не распаўсюджвацца толькі на ўдзельнікаў правых тэрарыстычных арганізацый, у тайных забойствах, сацыял-дэмакратычная фракцыя падала сваю прапанову, водгук якое прускі ўрад хацеў дамагацца ажыцьцяўленьня на ім абхвацце амністыі, якая не стыі такія вязьні, як Макс Гельц, які, як відома, быў засуджан па абвінавачаньні ў забойстве абшарніка.

На пасяджэньні юрыдычнае камісіі ляндтагу прапанова кампраміцы наконт абмежшэньня амністыі пакінута пакуль-што без разгляду. Другая-ж частка, якая даручае прускаму ўраду дамагацца ў агульна-нямецкім абхвацце амністыі ў памяніёных вышэй межах, адхілена.

СТАБІЛІЗАЦЫЯ ЗА КОШТ ЗВЫШЭКСПЛЕАТАЦЫІ РАБОЧЫХ.

НОВЫ ЗАКОН УЯЎЛЯЕ САБОЮ АБВЯШЧЭНЬНЕ ЭКАНАМІЧНАЕ ВАЙНЫ РАБОЧАЙ КЛЯСЕ.

Новы кошт стабілізаванага франка.

ПАРЫЖ. Згодна ўхваленага палатаю, а таксама сэнатам праэкту стабілізацыі валюты, франк стабілізуецца па курсу 124,24 франкі за фунт стэрлінгаў або 25,52 франкі за даляр.

Стабілізаваны франк будзе раўняцца 65,5 міліграмам золата. Каэфіцыент дэвалёрызацыі —4,92. 16 з паловаю міліярдаў, якія застаюцца пры пераацэнцы запасу францускага банку, пойдуць на згашэньне даўгоў дзяржаўнага банку апроч бонаў, якія знаходзяцца ў руках банку, зьяўляюцца пазыкаю, дадзенаю францускім урадам замежным урадам (расейскія боны).

Выступленьне т. Пікемаля ў палаце.

ПАРЫЖ, 25-6. Закон аб стабілізацыі франка ўхвален палатаю ў апошнім чытаньні большасьцю 448-мі галасоў проці 87-мі, у тым ліку 10-ці камуністаў, пры 183-х, якія ўстрымаліся, у ліку іх—99 сацыялістаў.

Выступаючы проці закону аб стабілізацыі Пікемаль заявіў ад імя кампфракцыі: «Сучасная стабілізацыя зьяўляецца прызнаньнем дзяржаўнага банкроцтва, якое стварылася ў выніку 14-цігадовае фінансавае палітыкі, што аплачвала за кошт рабочых, а таксама за кошт эруйнаваньня дробнае і сярэдняе буржуазеі і абагачэньня буйнае, сусьветную вайну з яе вынікамі: вайною ў Марока і Сірыі. Поруч з палёгкамі пры ападаткаваньні капіталістаў заработак адстае ад дарагоўлі. Дзеля правядзеньня капіталістычнае рацыяналізацыі, зьвязанае з звышэксплёатацыяй рабочых, з кожным днём павялічваюцца рэпрэсіі ў адносінах да рабочага руху і яго авангарду ў асобе камуністычнае партыі».

Сваю прамову Пікемаль скончыў так: «Вашая стабілізацыя зьяўляецца крыніцаю эканамічнае вайны, якая выкліча новыя войны, не зважаючы на лёкарнскае ліцамерства».

Францускі капітал наступае.

(З перадавіцы «Правды»).

«Правда» наконт стабілізацыі і рацыяналізацыі франка піша:

Стабілізацыя па курсу 124 франкі 21 сант за ангельскі фунт—замест нармальных 25 франкаў 22 сант. за фунт — канчаткова замацоўвае курс франка, які хістаецца з лістапада 1926 г, дзякуючы старанасьці ўраду нацыянальнага яднаньня. Ужо пры гэтым курсе можна было бачыць значны рост аптовых і рознічных цэн, які распачаўся пасьля першых спроб прыстасаваньня вытворчасьці да ўстаноўленага курсу.

Трэба падкрэсьліць, што ўся фінансавая палітыка нацыянальнага яднаньня, якую праводзіў Лушэр пасьля таго, як у красавіку 1926 году ён стаў міністрам фінансаў, трывае на значным павялічэньні падаткаў, у першую чаргу на рэчы спажываньня, г. зн. падаткаў, якія мацней ўсяго адбіваюцца на працоўных масах. Стабілізацыя франка вішчыць усе надзеі на зьніжэньне падаткаў на рэчы спажываньня.

Стабілізацыю франка трэба, нарэшце, разглядаць, як выходны пункт для працэсу прамысловае рацыяналізацыі, якая будзе праводзіцца ў шкоду рабочай клясе. Кляса прадпрыёмцаў надумалася стварыць моцны грунт для сваіх плянаў канцэнтрацыі і эканоміі. Ёй трэба было раз назаўсёды зафіксаваць кошт вытворчасьці, зьмешаны праз зьніжэньне заработку рабочым.

Наступ, такім парадкам, на пралетарыят узмацняецца.

Але, з другога боку, ён натыкаецца на рост адпору. Лік забастовак расьце, яны робяцца ўсё больш зацяжнымі. Некаторыя з іх канчаюцца перамогаю рабочых.

Стабілізацыя франка канчаткова вішчыць надзеі часткі дробнае буржуазеі і сялянства па дэвалёрызацыю (аднаўленьне) коштту франка. У гэтых колах стабілізацыя выкліча расчараваньне і непакой.

Ўвогуле завярэньні францускае кампартыі пры дапамозе Камінтэрну пацьвярджаюцца з матэматычнаю дакладнасьцю.

Праявы разладу ў нанкінскім лягеры.

ШАНХАЙ, 25-6. Шанхайская арганізацыя Гаміндану зьвярнулася да нанкінскага Гаміндану з заявай, што Ен-Сі-Шан, які займае пасаду камандуючага вайсковымі сіламі Пекін-Нанкінскага райёну, назначыў на выдатныя пасады двух генэралаў, якія ў часе сваёй улады ў Наньчане і Шанхаі займаліся расстрэламі гаміндаўцаў і вывешвалі на паказ адсечаныя галовы. Шанхайская арганізацыя лічыць, што нанкінскі ўрад павінен загадаць Ен-Сі-Шану зараз-жа арыштаваць гэтых асоб.

Адначасна хубэйская арганізацыя Гаміндану зьвярнула ўвагу цэнтральнае ўлады на патрэбу назначыць на ўрадавыя пасады на поўначы выключна выпрабаваных гаміндаўцаў.

У розных кітайскіх колах зазначаюць, што Ен-Сі-Шан, які выдае сябе за апошні час хворым, зусім ня хворы, а нездаволен адмовай нанкінскага ўраду зацьвердзіць некаторыя яго начначэньні і назначэньнем на гэтыя пасады новых людзей непасрэдна нанкінскім урадам.

ФЫНЬ-ЮЙ-СЯН ІДЗЕ Ў АДСТАЎКУ?

ШАНХАЙ, 25-6. У апошні час распаўсюджваюцца супярэчлівыя чуткі, што Фынь-Юй-Сян нібыта падаўся ў адстаўку, на якую нанкінскі ўраду не згадзіўся. Сёньня газэта «Шунь-Бао» паведамляе, што Фынь-Юй-Сян, здаўшы справы падначаленым, выехаў у Вэйхэй-Фу, зьвярнуўшыся да нанкінскага ўраду з просьбаю даць яму водпуск на 10 дзён.

ДАРЭМНЫЯ ПАТУГІ ЗДРАДНІКАЎ РЭВАЛЮЦЫІ.

ШАНХАЙ, 25-6. Арганізацыйны аддзел мясцовае арганізацыі Гаміндану зьвярнуўся да цэнтральных партыйных органаў з просьбаю адшукаць кары «маральнага ўзьдзейнічаньня», каб вярнуць на „шлях ісьціны“ значнага ліку юнакоў, якія запісаліся ў кампартыю.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЛЕНУМУ ЦК ГАМІНДАНУ.

ШАНХАЙ, 25-VI. ЦК Гаміндану прапануе ўсім сябрам ЦК, якія знаходзяцца заграніцаю, неадкладна вярнуцца ў Кітай для ўдзелу ў надыходзячым пленуме ЦК.

ПРАДСТАЎНІКІ ЧУЖАЗЕМНЫХ ПАСОЛЬСТВАЎ У НАНКІНЕ.

Шанхай, 25-VI. Водгук вестак з Пекіну, ангельскае, амэрыканскае і японскае пасольствы назначаюць сваіх прадстаўнікоў у Нанкін.

МУКДЭН СПЫНЯЕ ВАЙНУ.

ПЕКІН, 25-6. Вайсковая нарада ў Мукдэне ўхваліла спыніць баявыя апэрацыі і распачаць мірныя перамовы з Чан-Кай-Шы і Ен-Сі-Шанам.

АНГЕЛЬСКАЕ ВОЙСКА АКУПУЕ ТАНЬ-ШАНЬ

ПРЫЧЭПКА ДЛЯ АКУПАЦЫІ.

ШАНХАЙ, 25-6. Водгук вестак чужаземнага друку, у Таньшані, на паўднёвы ўсход ад Пекіну, паўночнае войска займаецца рабункамі і вымагае грошай ад гандлёвых палат, пагражаючы зруйнаваць капланскія вугольныя капальні. Становішча асабліва сур'ёзнае з прычыны адсутнасьці харчовых запасаў. У райёне капальняў знаходзіцца 50 ангельцаў. Ангельскія жанчыны і дзеці былі ўпачатку эвакуаваны.

Як паведамляе агенцтва Рэйтэра, з прычыны сучаснае небясьпекі для гэтых ангельцаў з порту Зэйхайвэй у райён капальняў выслан батальён салдат, якія, водгук слоў агенцтва, «будуць эвакуаваны, як толькі міне небясьпека для жыцьця і маемасьці ангельцаў».

Эўропа у абарону „Грамады“.

(Ад уласнага карэспандэнта).

Як мы ўжо адзначалі, з канцом працэсу над «Грамадой» ня скончылася справа „Грамады“. З кулураў віленскага суду і варшаўскае ахранкі яна перайшла на раздарожжы Эўропы, на суд эўрапейскага сумленьня. У імя гэтых прынцыпаў грамадзкая думка Эўропы пачала кампанію за перагляд сфабрыкаванага дэфэнзывай працэсу і неадкладнае вызваленьне вынявоненых.

Мы ўжо адзначылі выступленьні прэсы і тэлеграфны пратэст польскаму ўраду нямецкіх культурнікаў. Сёньня мы маем магчымасьць пазнаёміць беларускага чытача з тэкстам больш падрабязнага, больш абгрунтаванага і больш рашучага пратэсту-адозвы вучонага, літаратурнага і мастацкага сьвету Нямеччыны.

Пратэст накіраваны ўчора польскаму пасольству ў Бэрліне пры лісьце наступнага зьместу:

«Пры гэтым накіроўваем Вам адозву пісьменьнікаў, вучоных і мастакоў. Мы просім пераслаць дакумант польскаму ўраду і належным юрыдычным інстанцыям для перагляду справы беларускае „Грамады“, канец якой выклікаў сярод грамадзкасьці ўсіх краін справядлівае абурэньне».

Адозва падпісана 17 найбольш выдатнымі прадстаўнікамі культурнага сьвету Нямеччыны і апэлюе да сумленьня ўсяго сьвету.

Янка Б.

Бэрлін, 20-VI 1928 г.

ДА УСІХ КУЛЬТУРНЫХ КОЛАЎ ЭЎРОПЫ.

Вядомы польскі нацыянальны пісьменьнік праф. Пятрусэвіч сказаў адносна падаўна скончанага агіднага працэсу проці Беларускае «Грамады», што акты гэтага працэсу ніводзін гісторык у будучым ня здолее знайсьці і праверыць.

У сапраўднасьці дакументы, на аснове якіх было пабудавана абвінавачаньне, зьяўляецца фабрыкацыяй майстэрняў польскае дэфэнзывы—польскае тайнае паліцыі.

З чаго-ж, уласна складалася злачынства «Грамады»? Гутаркі пракуратуры і фашысцкая прэса ў Польшчы выказваюцца, што суд над «Грамадою» быў учынен дзякуючы таму, што яна вымагала самавызначэньня беларускага народу, зямлю для сялян і школы для моладзі. Гэта самае і элемэнтарнае права чалавека, захаваньне і ажыцьцяўленьне якога прыпісваюць „Грамадзе“ як злачынства.

Зразумела, што павінна быць прынята пад увагу адна акалічнасьць. На той бок паўночна-ўсходняе граніцы Польшчы беларускі народ заснаваў сваю ўласную рэспубліку—БССР, як частку СССР. У гэтай рэспубліцы беларускі народ мае поўнае самавызначэньне, сялянства—зямлю, і беларуская культура праз шырокае аднаўленьне. Таксама правы нацыянальных меншасьцяй Сав. Беларусі самым пераконваючым чынам прыняты пад увагу і захоўваюцца.

Польскі ўрад у адносінах да нацыянальных меншасьцяй вядзе яраз процілеглую палітыку.

Таму польская адміністрацыйная ўлада склала проці «Грамады» штучнае абвінавачаньне, нібы-та яна працавала па даручэньні «чужое дзяржавы». Гэтым зазначэньнем яна хацела законна абгрунтаваць прысуд, апраўдаць сябе ў вачох усяе грамадзкасьці.

Гэта «замашка» аднак, сутнасьці ня зьменіць, што патрабаваньне самавызначэньня, надзелу зямлёю і вольнага культурнага разьвіцьця ў Польшчы ганьбіцца і караецца, як дзяржаўная здрада.

З ліквідацыяй беларускае «Грамады» нішчыцца апошняя опора самаабароны нацыянальных меншасьцяй.

Польскі фашызм накіроўвае зараз усе свае сілы проці нацыянальных меншасьцяй, і асабліва проці заходня-беларускага насельніцтва.

Прасьледаваньні, арышты і катаваньні ў польскіх вастрогах стаяць у парадку дню. Рашткі гаспадарчага і культурнага быту нацыянальных меншасьцяй ужо на шляху да поўнага зруйнаваньня.

Усё гэта азначае той факт, што гэта кампанія вядзецца плянава, каб супольна з тэрорам вызваліць арэну для польскага фашызму, з яго імкненьнем арганізаваць вайну проці сваіх усходніх суседзяй—Саюзу Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

Мы пратэстуем проці тэрарыстычнага прысуду над „Грамадой“.

Мы заклікаем усе сумленныя колы, культурных працаўнікоў і дзеячоў усіх краін прынясьці актыўны ўдзел у рэвізіі гэтага тэрарыстычнага прысуду.

Мы патрабуем вызваленьня ўсіх засуджаных і прасьледуемых.

Мы заклікаем увесь сьвет зьнішчыць кампанію падрыхтоўкі да вайны і заступіцца за вызваленьне польскіх нацыянальных меншасьцяй, а таксама заходня-беларускага народу.

Мы патрабуем ад усіх заснаваньня шчыльнага саюзу з прыгнечанымі і прасьледуемымі меншасьцямі Польшчы. Мы заклікаем усіх дзеячоў і культурных працаўнікоў сьвету злучыцца дзеля аказаньня дапамогі абаронцам нацыянальных меншасьцяй Польшчы.

Прафэсар Гэнрых Цылле—сябра Прускае Акадэміі мастацтваў, Эрвін Піскатар—ржысэр тэатру «Піскатар-Эстрада», д-р Альфонс Раквет—пісьменьнік, Отто Леман—генэральны сэкратар нямецкае Лігі Правоў Чалавека, д-р філёзофіі Галена Штэккер, праф. Альфонс Гольдшмідт, праф. Пауль Гэстэрэйх—сябра сацыялістычнае партыі Нямеччыны, Вільлі Мюнцэнбэрг—сябра Рэйхстагу, д-р Курт Гільдер—пісьменьнік, праф. д-р Кароль Грюнбэрг, Гэорг Ледэбур—правадыр незалежнае сацыял-дэмакрат, партыі Нямеччыны, д-р Фрыц Аўслендэр—сябра прускага ляндтагу, д-р Эрвін Ругэ—пісьменьнік, д-р Якобі—вышэйшы ўрадавы радца, праф. д-р Бэргэр, Эрнст Тольлер—драматург, Гюго Дёблін—пісьменьнік, Іоганэс Бэхер—пралетарскі паэта і пісьменьнік.

Артыкул т. СТАЛІНА

СУПРОЦЬ АПАГАНЬВАНЬНЯ ЛЁЗУНГУ САМАКРЫТЫКІ.

Самакрытыка — бальшавіцкі мэтад выхаваньня.

Лёзунг самакрытыкі не зьяўляецца нечым мімалётным, што хутка пераходзіць. Самакрытыка ёсьць асаблівы мэтад, бальшавіцкі мэтад выхаваньня кадраў партыі, а таксама і рабочае клясы наогул, у духу рэвалюцыйнага разьвіцьця. Яшчэ Маркс гаварыў аб самакрытыцы, як аб мэтадзе ўзмацненьня пралетарскае рэвалюцыі. Што датычыць самакрытыкі нашай партыі, дык пачатак гэтай самакрытыкі адносіцца да пачатку зьяўленьня бальшавізму ў нашым краі самых першых дзён яго зараджэньня, як асобнай рэвалюцыйнай плыні ў рабочым руху. Вядома, што Ленін яшчэ ўвесну 1904 году, калі бальшавізм не зьяўляўся самастойнай палітычнай партыяй, а працаваў супольна з меншавікамі ў складзе аднэй сацыял-дэмакратычнай партыі, дык Ленін ужо тагды заклікаў партыю «да самакрытыкі, а таксама да бязьлітаснага выкрыцьця ўласных мінусаў».

Вось што пісаў тагды Ленін у сваёй брашуры: „Шаг вперед, два шага назад“. «Яны (г. зн. супрацоўнікі марксістых) злосна радуюцца, крыўляюцца наглядаючы нашыя спрэчкі. Яны пастараюцца, зразумела, вырываць для сваіх мэтаў асобныя месцы з маёй брашуры, прысьвечанай недахопам нашай партыі. Расейскія сацыял-дэмакраты ўжо досыць абстраляны ў бойках, каб ня пужацца гэтых шчыпкоў, і каб праводзіць далей наперакор ім сваю працу самакрытыкі, бязьлітаснага выкрыцьця ўласных мінусаў, якія абавязкова і намінуча будуць пераможаны з ростам рабочага руху. Пану супрацоўнікі няхай паспробуюць прадставіць нам малюнак сапраўднага становішча спраў у іх «партыях», які хоць крыху набліжаецца да таго малюнку, што даюць нам пратаколы нашага 2-га зьезду». (Том 5, стар. 307).

Таму зусім ня маюць рацыі тыя таварышы, якія думаюць што самакрытыка ёсьць мімалётнае зьявішча, мода, якая павінна ў хуткім часе выйсьці ў тыраж, таксама, як выходзіць звычайна ў тыраж кожная мода; што самакрытыка—справа добрая для партыі, якая ня прышла да ўлады, якой «няма чаго траціць», але самакрытыка небясьпечна і шкодна для партыі якая ўжо прышла да ўлады, якая мае ў абкружэньні варожыя сілы, супроць якой ворагі могуць выкарыстаць яе слабасьці. Гэта няправільна.

Няправільна, што самакрытыка небясьпечна для партыі, якая стаіць ва ўладзе

Наадварот, іменна таму, што бальшавізм прышоў да ўлады, іменна таму, што бальшавікі могуць зазнацца дзякуючы посьпехам нашага будаўніцтва, іменна таму, што бальшавікі могуць незаважыць сваіх слабасьцяў і тым палегчыць справу сваіх ворагаў, іменна для гэтага патрэбна самакрытыка, асабліва цяпер, асабліва пасьля захопу ўлады. Самакрытыка мае на мэце выкрыцьцё і ліквідацыю нашых памылак, нашых слабасьцяў—ці-ж ня ясна, што самакрытыка ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту можа толькі палегчыць справу барацьбы бальшавізму з ворагамі рабочае клясы? Ленін улічваў гэтыя асаблівасьці становішча пасьля захопу ўлады бальшавікамі, калі ён пісаў у сваёй брашуры «Детская болезнь «левизны» в коммунизме» у маі 1920 году: «Адносіны палітычнай партыі да яе памылак зьяўляюцца адным з найважнейшых і вярнейшых крытэрыяў сур'ёзнасьці партыі і выкананьня ёю на справе сваіх абавязкаў у дачыненьні да сваёй клясы, а таксама да працоўных мас.

Адкрыта прызнаць памылку, выкрыць яе прычыны, прааналізаваць абставіны, якія яе выклікалі, абмеркаваць уважліва сродкі, **выправіць памылку—вось гэта адзнака сур'ёзнай партыі**, вось гэта выкананьне ёю сваіх абавязкаў, вось гэта выхаваньне і навучаньне клясы, а потым і масы“ (Том 17, стар. 147).

Ленін тысячу разоў меў рацыю калі гаварыў на 11-м зьезьдзе партыі ў сакавіку 1922 году: „Пралетарыят не баіцца прызнаць, што ў яго рэвалюцыі вось гэта вышла добра, а вось гэта ня вышла. Усе рэвалюцыйныя партыі, якія да гэтага часу гінулі, гінулі таму, што зазнаваліся, а таксама і таму, што ня ўмелі бачыць у чым сіла; яны баяліся гаварыць пра свае слабасьці. А мы не загінем таму, што не баімся гаварыць пра свае слабасьці, а таксама навучымся перамагаць свае слабасьці“ (Том 18, частка 2, стар. 59).

Вывад адзін: без самакрытыкі няма правільнага выхаваньня партыі, клясы і мас. Без правільнага выхаваньня партыі, клясы і мас няма бальшавізму.

Чаму лёзунг самакрытыкі набыў асаблівa актуальнае значэньне іменна зараз, іменна ў даную гістарычную хвіліну, іменна ў 1928 годзе? Таму, што цяпер больш яскрава, чым год альбо два гады назад выявілася абвастрэньне клясавых адносін. Таму, што зараз больш яскрава, чым год ці два гады назад, выявілася наліччa падкопнай работы клясавых ворагаў савецкай улады, якія выкарыстоўваюць нашы слабасьці, нашы памылкі супроць рабочае клясы нашага краю. Таму, што ўрокі шахцінскай справы, а таксама «загатоўчых маневраў», капіталістычных элемэнтаў вёскі, плюс нашы памылкі плянавага парадку ня могуць, а таксама не павінны прайсьці міма нас бясьследна. Трэба хутчэй вызваліцца ад нашых памылак, слабасьцяў, якія выкрыты шахцінскаю справаю, загатоўчымі цяжкасьцямі з хлебам, калі хочам узмацніць рэвалюцыю і сустрэць ворагаў у поўнай зброі. Трэба як мага хутчэй выкрываць нашы слабасьці, памылкі, якія яшчэ нявыкрыты, але якія бязумоўна існуюць, калі мы ня хочам быць захопленымі зьнянацку розчымі «нечаканасьцямі» і «выпадковасьцямі» на радасьць ворагам рабочае клясы. Марудзіць тут—значыць палегчыць справу нашых ворагаў, паглыбіць нашы слабасьці і памылкі. Але зрабіць усё гэта немагчыма без разгортваньня самакрытыкі, без узмацненьня самакрытыкі, без уцягненьня мільённых мас рабочае клясы і сялянства ў справу выяўленьня і ліквідацыі нашых слабасьцяў і нашых памылак. Пленум ЦК і ЦКК у красавіку з гэтае прычыны не памыліўся, калі сказаў у сваёй рэзалюцыі па шахцінскай справе, што «галоўнаю ўмоваю для забясьпечаньня пасьпяховага праведзеньня ўсіх намечаных мерапрыёмстваў павінна быць сапраўднае ажыцьцяўленьне лёзунгу зьезду аб самакрытыцы». Але, каб разгарнуць самакрытыку, трэба перш-на-перш перамагчы рад перашкод, якія стаяць перад партыяй. Сюды адносяцца культурная адсталасьць мас, недахват культурных сіл пралетарскага авангарду, нашае «камчванства» і г. д. Аднак, аднэй з сур'ёзных перашкод, калі ня самаю

сур'ёзнаю перашкодаю, зьяўляецца бюракратызм нашых апаратаў.

Справа ідзе аб наліччы бюракратычных элемэнтаў у складзе нашых партыйных, дзяржаўных, прафэсыянальных, кааперацыйных і розных іншых арганізацый. Справа ідзе аб бюракратычных элемэнтах, якія жывуць нашымі слабасьцямі і памылкамі, якія баяцца, як агню, крытыкі мас, кантролю мас, якія перашкаджаюць нам разгарнуць самакрытыку, якія перашкаджаюць нам вызваліцца ад нашых слабасьцяў, ад нашых памылак. Бюракратызм у нашых арганізацыях, не зьяўляецца толькі цеганінаю, канцэлярычнаю. Бюракратызм ёсьць праяўленьне буржуазнага ўплыву на нашы арганізацыі. Ленін меў рацыю, калі гаварыў: „Трэба, каб мы зразумелі, што барацьба з бюракратызмам, ёсьць барацьба абсалютна неабходная, што яна такая-ж складная, як задача барацьбы з дробна-буржуазнай стыхіяй. Бюракратызм у нашым дзяржаўным ладзе набыў значэньне такой балячкі, што аб ёй гаворыць наша партыйная праграма. Гэта таму, што ён зьвязан з гэтай дробна-буржуазнай стыхіяй, з яе распыленасьцю“ (Т. 18, ч. I, ст. 122). З тым большаю настойлівасьцю павінна весьціся барацьба супроць бюракратызму нашых арганізацый, калі мы сапраўды хочам разгарнуць самакрытыку і вызваліцца ад балячак нашага будаўніцтва. З тым большай настойлівасьцю **МЫ ПАВІННЫ ЎЦЯГВАЦЬ МІЛІЁННЫЯ МАСЫ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН У СПРАВУ КРЫТЫКІ

У Саюзе ССР.

Заява групы трацкістаў у ЦК УсеКП(б).

МАСКВА. 25-VI. У «Правде» зьмешчана заява Сафарава, Вардзіна і Навумава у ЦКК УсеКП(б). У заяве гэтай, між іншым, зазначана: згодна патрабаваньня 15-га зьезду, мы здымаем свае подпісы пад платформаю 13-ці і пад заявою 83-х і заяўляем аб сваім ідэйным і арганізацыйным разброеньні, прызнаём памылкаю фракцыйныя адносіны да партыйнага кіраўніцтва ў асобе ЦК партыі, якія выкліканы былі ў выніку кінчуванага абавтрэньня ўнутрыпартыйнае барацьбы, лічым бясспрэчна направільнымі ўсе спробы апэляваньня да беспартыйных у вывазку з унутрыпартыйнымі непаразумкньнямі, прызнаём, што нашая фракцыйная дзейнасьць ва УсеКП(б) і Камінтэрне штурхнула асобныя групы апазіцыі на шлях, які аб'ектыўна вядзе да другое партыі.

Адозва ЦК ад 3-га чэрвеня—зазначана далей у заяве—зьяўляецца баявым загадам аб мабілізацыі ўсіх бальшавіцкіх пралетарскіх сіл для барацьбы з удзесяцераною энэргіяй за справу Леніна. Мы на можам стаць в бочу ад барацьбы ў імя перамогі справы, за якую два дзесятні гадоў змагаліся ў радох партыі. Просім ЦКК аднавіць нас у правох сяброў бальшавіцкае партыі і гэтым даць нам магчымасьць выканаць свой абавязак салдатаў пралетарскае рэвалюцыі.

Перавод капальняў на 6-гадзінны дзень.

МАСКВА. ЦК саюзу горнарабочых дзеля вопыту пераводзіць 2 капальні Данбасу на 6-цігадзінны рабочы дзень. Пасьля выяўленьня вынікаў будзе дакладна ўстаноўлен тэрмін такога пераходу ва ўсёй вугольнай прамысловасьці з тым, каб гэта не павялічыла сабекошту.

ОРДЭН ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЬЦЯГУ.

МАСКВА, 25-6. Саюзны СНК адобрыў і падаў на зацьверджаньне прэзыдыуму ЦВК Саюзу статут ордэну Працоўнага Чырвонага Сьцягу Саюзу. Статут засноўваецца для адзначэньня выключных заслуг перад Саюзам або асобнымі саюзнымі рэспублікамі ў галіне вытворчасьці, навуковае дзейнасьці, дзяржаўнае ці грамадзкае службы.

Новая магутная фабрыка пшаніцы.

САМАРА, 23-VI. У Бузулуцкім павеце пад магутную савецкую гаспадарку адводзіцца 27 тысяч гэктараў. Сёлета робіцца першая запашка на 10 тысяч гэктараў.

Змаганьне беднаты з утойшчыкамі хлеба.

СЬВЯРДЛОЎСК, 25-6. У Курганскай акрузе сялянская беднота праводзіць у апошні час актыўную барацьбу проці ўтойваньня хлеба заможнаю часткаю вёскі. Агульны сход сялян патрабуе выселіць з межаў Уралу злосных утойчшыкаў хлеба і канфіскаваць маемасьць і лішкі хлеба ад іх. Такая пастанова сялян вёскі Ключыкі ў адносінах да кулака Аляксандрава пададзена ў суд, які засудзіў Аляксандрава да канфіскацыі маемасьці і лішкаў хлеба з высяленьнем на 3 гады з межаў Уралу.

Такія-ж прысуды ўхвалены ў вёсцы Дамаціраве ў адносінах да кулака Меншыкава і ў вёсцы Сіменаўцы. Актыўны ўдзел беднаты ў справе павялічэньня загатовак ужо даў станоўчыя вынікі. Загатоўкі значна павялічыліся і ў некаторых раёнах чэрвеньскі плян ужо выканан поўнасьцю.

УРАДЖАЙ БУДЗЕ ЛЕПШЫ ЗА ЛЕТАШНІ.

МАСКВА, 26-7. Водлуг папярэдніх даных матар'ялаў ЦСУ СССР, стан засеваў на 15 чэрвеня паказвае далейшае палепшаньне ў параўнаньні з 1-м чэрвеня. Палепшылася ня толькі ярына, якая сёлета наогул вельмі здавальняючая, але і пацярпеўшая азімінь. Наогул стан засеваў па СССР за гэтыя 15 дзён узьняўся в 112 пунктаў да 117 пунктаў. Сярэдняму ўраджаю адпавядае 100 пунктаў.

Згодна даных на 15 чэрвеня можна такім парадкам чакаць ураджаю крыху вышэй сярэдняга і прытым лепшага за леташні.

Самы буйны выйгрыш Авіёлётарэі.

СІМФЭРОПАЛЬ, 25-6. У Крымскую кантору Дзяржаўнага банку пададзен білет № 2739 серыі 257 другое ўсесаюзнае лётарэі ТДА-Авіяхіму. На гэты білет прыпаў самы буйны выйгрыш лётарэі—падарожная ў любую частку сьвету па выбару выйграўшага або 7500 рублёў.

Паназчым білету адмовіўся назваць сваё прозьвішча, зазначыўшы толькі, што ён сябра прафсаюзу. Выйгрыш ён пажадаў атрымаць грашыма.

Засільле кулакоў.

Яраслаўль 22-6. З-за бязьдзейнасьці мясцовае ўлады і арганізацый, кулакі Караскае волаські, Растоўскага павету канчаткова закабалілі беднату. Кулакі захапілі зямлю беднякоў, арандуюць ё на 2-3 рублі за год. Адзін з кулакоў карчмар Мацьвееў зааарандаваў такім парадкам палову вялмельных надзелаў беднякоў вёскі Ільляр. У Ільляскім сельсавеце старшынёю быў Марцьянаў—сваяк буйных кулакоў і лесапрамыслоўцаў. Пры яго дапамозе кулакі вываляліся ад падаткаў.

Паўгода барацьбы швэдзкіх гарнякоў.

УДЗЯЧНАСЬЦЬ БАСТУЮЧЫХ ЗА БРАТНЯЕ ПАДТРЫМАНЬНЕ.

МАСКВА. 23-VI. Швэдзкія гарнякі бастуюць ужо паўгода. 23-га чэрвеня ЦК саюзу горнарабочых СССР пераслаў на дапамогу бастуючым гарнякам Швэдыі 361.500 рублёў.

23 чэрвеня ад старшыні швэдзкага саюзу горнякоў Хансона атрыман на імя ЦК саюзу горнарабочых СССР ліст з выказам удзячнасьці за сяброўскую дапамогу. „Мы спадзяёмся,—зазначана ў лісьце,—што нашы савецкія браты і ў далейшым дадуць нам матар'яльную дапамогу. Мы намераны змагацца проці ўлады прадпрыёмцаў да канчатковае перамогі».

Справа шахцінскіх контр-рэвалюцыянэраў.

ШКОДНІЦКІ МАСКОЎСКІ ЦЭНТР.

Скарута вымушан прызнацца і „пакаяцца".

МАСКВА. На вячэрнім пасяджаньні суду па шахцінскай справе 25-га чэрвеня Крыленка кажа, што, між іншым, у заяве Скаруты, дзе ён прызнае сваю віну, падсудны зазначае на сваё дрэннае матар'яльнае становішча ў чэрвені 1925 году, калі ён прыехаў у Маскву. Тады-ж ён атрымаў першыя грошы ад Рабіновіча і за гэтыя грошы набыў хатнюю мэблю на суму блізка тысячы рублёў. Пракуратура ў часе перапынку пасяджэньня даручыла сьледчаму апарату дапытаць дворніка таго дому, дзе жыў Скарута, потым кіраўніцтва справамі дому, і таксама кватарантаў, што жылі побач з Скарутам—Канапацкага, Ільменева і Карбушына. „Гэтыя асобы,—кажа Крыленка,—зусім не зацікаўленыя ў справе, пацьвердзілі, што сапраўды ўвосень 1925 году Скарута набыў мэблю прыблізна на гэтую суму. Я лічу магчымым прасіць спэцыяльны склад суду далучыць 3 пратаколы допыту гэтых асоб да справы, каб у выпадку патрэбы выклікаць гэтых асоб для пацьверджаньня сваіх паказаньняў". Аднак з прычыны элемэнтарнае простасьці гэтага факту і адсутнасьці зацікаўленасьці дапытаных асоб, пракуратура абмяжоўваецца далучэньнем гэтых дакумантаў.

Пасьля заявы Крыленкі да судовага стала надыходзіць абвінавачаны Скарута і кажа: «Таварыш старшыня, дакладаў ніякіх ня трэба. Маё прызнаньне ў першай заяве праўдзівае. Калі я яе падаў, дык на мяне ўночы напаў страшэнны жах перад злачынствам, аб якім ніхто з маіх блізкіх і камуністых знаёмых ня ведаў. Пра сваю працу, пра свае дачыненьні да чырвоных дабрахвотнікаў і да савету зьезду горнапрамыслоўцаў я казаў праўду. Але я казаў няпраўду пра ўсё, што датычылася арганізацыі, калі я адмаўляўся ад яе ў тым выглядзе, як гэта запісана ў маёй заяве. Я павінен прасіць, каб вы мне даравалі. Гэта сапраўды дзіўныя перажываньні, за 2 месяцы яны мяне замучылі. Было страшна сазнацца ў злачынствах, пра якія ніхто ня ведаў. Але-ж нельга жыць, ведаючы, што зрабіў такое злачынства. Учора я сазнаўся, але ізноў пахіснуўся. Я сазнаюся. Усё, што я напісаў, гэта праўда»...

На запытаньне Вышынскага, ці пацьвярджае ён поўнасьцю ўсё напісанае ў першай заяве, Скарута адказвае станоўча.

Суд далучае да справы пратаколы допыту Канапацкага, Ільменева і Карбушына, спэцыяльнае-ж абсьледаваньне злачынае дзейнасьці Скаруты, у якой ён прызнаў сябе вінаватым, ухвалена перанесьці на зачыненае пасяджэньне.

Паказаньні быўш. горнаўласьніка Рабіновіча.

Далей суд пераходзіць да допыту Рабіновіча, ранейшага вугленрамыслоўцы, які ня прызнаў сябе вінаватым.

ЯК ГОЛІК СТАЎ МІЛІ�янэРАМ.

Рабіновіч падрабязна апісвае, «як ён нажыў мілёны, хоць і вельмі маленькія». Ён працаваў, водлуг яго слоў, у раўнай меры з рабочымі. Не зважаючы на вялікія прыбыткі, якія Рабіновіч атрымліваў у якасьці ўласьніка капальняў, яго штомесячны бюджэт ніколі не перавышаў 400-500 рублёў. У 40-кагадовым узросьце Рабіновіч «ужо стаў набліжацца да мілёну». У яго зьявілася думка жыць для самога сябе, але перашкодзіла «прагнасьць творчасьці». Падварулася «новая справа», рызыкоўная, нявэўная, але на выпадак удачы вельмі прыбыткова.

Рабіновіч заяўляе, што да часу Кастрычнікавае рэвалюцыі ў яго ідэалёгіі быў «поўны комплекс сацыялістычнае дзяржавы». Для доказу ён нават коратка сьпяняецца на сваіх адносінах да «рабочае клясы». Зьяўляючыся ўласьнікам капальняў, ён быў сябром таварыства дапамогі горнарабочым у свой час.

РАБІНОВІЧ «ДУША Ў ДУШУ» З РАБОЧЫМІ.

Рабіновіч лічыць сябе людзь не палітычным агітатарам. У часе «бунту» рабочых 1905 году на рудніку, якім уладаў Рабіновіч, ён прыехаў на рудзік, склікаў сход упаўнаважаных ад рабочых і адразу-ж згадзіўся на «дробныя» патрабаваньні рабочых аб волі стачак, саюзаў і г. д. Аднак, Рабіновіч, як кажа, на мог задаволіць дамаганьні рабочых наконт 8-мігадзіннага рабочага дню. Нязгода была выклікана ня тым, што Рабіновіч зьяўляецца прыцыповым ворагам 8-мігадзіннага рабочага дню. У нерамовах з рабочымі Рабіновіч даўеў, што 8-мігадзінны рабочы дзень дасьць рабочым толькі шкоду. Вось так ідэалёгія, на падставе якое ён нават імкнуўся пераканаць суд у поўнай немагчымасьці для яго ўзьдельнічаць у якой-небудзь контр-рэвалюцыйнай і шкодніцкай дзейнасьці.

Пасьля некалькіх запытаньняў старшыні Вышынскага наконт службовага становішча падсуднага і яго арышту, допыт Рабіновіча пераходзіць да дзяржаўнага абвінаўча т. Крыленкі, які выяўляе, што «будаваў» абвінавачаны Рабіновіч у часе свайго найбольшага дабрабыту. У 1914 годзе Рабіновіч з кіраўніка чужымі рудзікамі і працоўніка «на процантах» робіцца фактычным уласьнікам рудзіка, акцыянэрам Пагуреўскага таварыства, у якім яму належыць 60 проц. акцый—на 2 мілёны па наміналу.

Водлуг слоў Рабіновіча, па сутнасьці ён меў акцый на мілён, а на мілён доўгу. Пэрыяд банкроцтваў і абагачэньняў Рабіновіч, як ён кажа, перанесіў пафілёзофскі. Наогул Рабіновіч лічыць, што калі ўжо разьбіраць, як і чаму ён рабіў тыя ці іншыя махінацыі, дык трэба было-б узяць пад увагу гістарычныя пэрспэктывы, як гэта гаворыцца па Маркасу, а таксама эканалічныя ўзаемаадносіны клясаў.

РАБІНОВІЧ—ПАЛІТЫЧНЫ ДЗЕЯЧ.

Ці займаў ён якое-небудзь становішча ва Ўрадавым і фінансавым сьвеце? „Ніякага"—адказвае Рабіновіч.

— Ну, а з Вітсэ мелі гутаркі?

— «Гэта ў якасьці прадстаўніка грамадзкае арганізацыі». Гэтай «грамадзкай арганізацыяй» быў савет зьезду горнапрамыслоўцаў, а Рабіновіч быў гаваровым сябрам гэтага савету. Ён гэтага і не адхіляе. Як сябра гэтага савету, Рабіновіч прайшоў і ў 2-ю дзяржаўную думу па сьпісу кадэтаў, хоць і ня быў кадэтам.

РАБІНОВІЧ—«РЭВАЛЮЦЫЯНЭР».

Рабіновіч сазнаецца, што праграма савету зьезду далёка не абаранала інтарэсаў рабочае клясы. Аб тым, што кляса капіталістаў зьяўляецца клясаю, якая дамагаецца поўнага падначаленьня сабе, Рабіновіч, як ён кажа, зразумеў упершыню яшчэ ў 1888 годзе, а пераканаўся ў 1916 годзе, калі вышаў з Данецка-Грушаўскага таварыства. „Я-ж ня мог вымяніць капіталістычнага ладу,—зазначае ён,—а ісьці ў рэвалюцыйныя дзеячы ня было сэнсу, бо ў Туруханскім краі было менш магчымасьці выкарыстаць свае сілы, чымся на жывой працы». Вось чаму ён і «падначаліўся» жаданьню капіталістаў.

У 1905 годзе Рабіновіч рэальна пазнаёміўся з тым, што нельга ня слухацца капіталістаў. Ён быў старшынёю саюзу інжынэраў, ходзіў на могілкі з прамовамі і за гэтыя прамовы яго арыштавалі і пасадзілі ў астрог. «Як відаць, мяне прызналі за дзяржаўнага злачынцу,—кажа ён.

— Значыць, капіталісты вам сказалі, што, калі вы не супакоіцеся, дык...?

— Яны мяне папрасілі ісьці іншымі завуліцамі, пагражалі абвясьціць байкот—адказвае Рабіновіч. Аднак, тыя-ж капіталісты дапанаглі яму замест Архангельску трапіць заграніцу. Ён быў высланы на 3 гады, а вярнуўся праз 3 месяцы.

— Хто-ж вам дапамог?

— Дырэктар фрэнпускага банку Вітсэ.

— Мо' таму, што Вітсэ ў гэты час праводзіў перамовы аб пазыцы для Расеі?

— Але-ж, таму—адказвае Рабіновіч. Аднак і пасьля звароту з „ссылкі" яго «рэвалюцыйны» пал не прастыў, бо на зьезьдзе горнапрамыслоўцаў у 1906 годзе ён выступіў з заявою, што „да рабочага законадаўніцтва трэба прыцягваць саміх рабочых".

У 1925 годзе Рабіновіч апынуўся ў тэхнічным савеце Донвугалю. З інжынэрскага складу ён добра вялаў ранейшых Баярышнава Берозоўскага, Гарлецкага, Панчыча, Бэхтэра, Матава, Дашынскага і інш., а з ранейшых гаспадароў—Дзяржанчыка, Андэрсона, Сакалова, Штэцінга, Праджіна, Рэно і Бураса.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Польскі калгас імя „Дзяржынскага".

КІЧЧАЎ. Да Кастрычнікавай рэвалюцыі ўсяму насельніцтву сучаснага Кіччаўскага райёну было вядома прозьвішча Незабытоўскага і ня толькі па райёну, але і акрузе. Гэта быў пан Незабытоўскі—член государственной думы; ён меў дзесяткі тысяч дзесяцін зямлі ў сучасным Кіччаўскім раёне, некалькі заводаў у гор. Бабруйску і будынкаў, амаль-што цэлы кварталі. Адным словам, фэодал, на якога працавала амаль усё насельніцтва сучаснай Бабруйскай акругі. Сам ён ніколі тут не знаходзіўся, а толькі атрымліваў грошы—былі падпанкі, кіруючыя ўсёй справай.

Ён езьдзіў па Эўропе і жыў у буйных гарадох, як Парыж, Берлін, Лёндан і інш.

У сучасны момант пан Незабытоўскі зьяўляецца міністрам зямельных спраў у Польшчы. Ён праводзіць зямельную рэформу ў Польшчы. Кастрычнікавая рэвалюцыя эвакуіравала яго за межы Савецкай Беларусі.

А тут робіцца вялікая справа, зусім іншая, чым была раней. На заводах, належачых раней Незабытоўскаму, працуюць тыя-ж самыя рабочыя, але цяпер яны самі зьяўляюцца гаспадарамі і кіраўнікамі. Палявыя абшары належаць калкам і поўнасьцю тым 6. парабкам, якія працавалі раней на пана. Уся гэта праца праходзіць не абы як. Істнуе адзін савгас, некалькі пасёлкаў і гэтай вясной арганізаван польскі калгас, прысвоіўшы імя «Дзяржынскага». Сацыяльны склад сяброў калгасу выключна палякі-беднякі (5 сем'яў). Амаль-што ўсе яны і нарадзіліся ў гэтым маёнтку, дзе цяпер калгас (6. маёнтак Вольса).

З 1-га дню жыцьця ў калгасе сябры калгасу абралі праўленьне, між якім разьмеркавалі абавязкі, ліквідавалі ўсю оваю мяркавалі абавязкі, а маемасьць стала лічыцца ўласнасьць, а маемасьць стала лічыцца агульнай. Разьмясьціліся ў 2-хвярховым будынку і па пастанове агульнага сходу адвялі адзін паной для правядзеньня культурнай працы. Ужо выпісваюцца газэты: «Орка», „Камуніст", „Савецкая Беларусь", і таксама часопісі і кнігі.

У гэтым-жа паной калісь сабіраліся на лета фэадалы-паны для здавальненьня сваей прыхаці.

Шчыра ўзяліся за працу сябры калгасу.

Разьмяркована праца памім мужчынамі і жанчынамі. Абсеялі ўсё чыста поле, добра даглядаюць скаціну, культывіруюць сад (8 дзесяцін), прывялі ў належны від гадавальнік і прыступілі да рамонту памяшканьня. Кіпіць праца ў руках працоўных, бо гэта калектыўная праца.

Не падабаецца ўсё кулацкай частцы польскага насельніцтва тое, што гаспадарамі ўсяго дабра зьяўляюцца беднякі. Распускаюць усялякія чуткі, каб унесьці разлад сярод калектывістаў.

Мясцовым установам трэба больш зьвярнуць увагі на замацаваньне гэтай вялікай справы, за якую ўзяліся палякі-беднякі.

АНОЦКІ.

АБЫШЛІСЯ БЕЗ ПАДРАДЧЫКА

Як раней, так і цяпер сяляне Бывалькаўскага с.-с. (Лоеўскі раён) хадзілі працаваць на вязку і сплаў леса.

Па гэтай рабоце большасьць сялянства сельсавету лічылася спэцыялістамі. Дагэтуль нанімаліся на працу ў адзіночку, атрымлівалі ад падрадчыка 1 р.—1 р. 50 кап. у дзень. Рабэмлес працаваў і працуе ў раённе дрэнна. Зузім не турбаваўся, каб уцягнуць беднату ў працу па вязцы падтаварніка і сплаву. Калі бедняка браў на работу падрадчык, дык мала што эксплёатаваў, але яшчэ і зьдекваўся.

Беднаты ў вёсках сельсавету многа. Не зарабіўшы на старане пражыць цяжка. Вось у сёлетнюю зіму Сіньская ячэйка КП(б)Б і рашыла, апрача палітычнай работы сярод беднаты, памагчы ёй стаць на ногі матар'яльна. Ячэйка дагаварылася з канторай Украінсплаву, каб яна ўзяла сялян па працу арганізованым парадкам. Усю зіму ўгаварывалі беднякоў самім арганізаваць вясной арцелі. Адабралі найбольш бедных сялян і арганізавалі 4 арцелі. Залічылі туды і тых беднякоў, якія спачатку не хацелі ісьці.

Усяго беднаты ў арцелі ўцягнута: I—76 чал., II—67 чал., III—30 чал., IУ—15 чалавек. Зарабляе ў сярэднім кожны ўдзельнік арцелі ад 2 да 2 р. 50 кап. Вёскі Бувалькі, Сіньск, пасёлкі Трасьцянец, Гарадок і Будзішча за гэта лета паправяць сваё эканамічнае становішча. **Сяляне здаволены і дзівяцца, чаму дагэтуль так не рабілі.** Прароблены вопыт па забесьпячэньню беднаты работай канчатоўны. Адно дрэнна. Усю гэту працу рабіў камуніст старшыня сельсавету і забыўся, што трэба было, каб ячэйка КП(б)Б уся цалкам прымала ўдзел у такой важнай рабоце. Таксама дрэнна, што беднота падбіралася праз сельсавет, бадай бяз ніякага ўдзелу камітэту ўзаемадапамогі.

На Беларусі сплавам займаецца многа сялянства. Райкомам партыі, дзе сялянства ходзе на сплаў, варта выкарыстаць сіньскі вопыт. Калі на сплаў і вязку пойдзе ў першую чаргу беднота—гэта будзе азначаць, што партячэйкі бліжэйшых да сплаву вёсак не на словах, а на справе кіруюць беднатой, паляпшаюць яе дабрабыт.

С. Ч.

М. Лоеў, Гомельшчына.

Палепшаньне быту працаўнікоў зямлі і лесу.

ГОМЕЛЬ, 26-6. Сёлета на палепшаньне быту працаўнікоў зямлі і лесу будзе асігнавана 11 тысяч руб. З іх на клюбнае будаўніцтва—у лясьніцтвах—1500 руб., на пашырэньне сеткі кіно-перасовак—2000, на радыё-будаўніцтва—1500, на дзіцячыя пляцоўкі—2000, на курортнае лячэньне—3000, на культпрацу—1600.

62 вылучэнцы рабочых.

Барысаў, 26-VI. Усяго к сучаснаму моманту па Барысаўшчыне налічваецца 62 вылучэнцы—мужчын 52 і жанчын—10.

З агульнага ліку высунута на прафпрацу—20 мужчын і 5 жанчын, на адм.-гаспадарчую—24 мужч. і 3 жанч. і на савецкую—8 мужч. і 2 жанчыны. Азначаецца, што ФЗМК не практыкуецца скліканьне агульных сходаў вылучэнцаў, а таксама адсутнічае точны вучот апошніх.

Прафарганізацыям належыць гэткую непарамальнасьць выжыць, а таксама неабходна аказваць вылучэнцам падтрыманьне ў іх штодзённай працы.

Падрыктоўка да перавыбараў саветаў.

Гомель, 26-6. У зьвязку з наближэньнем перавыбараў саветаў, Акрвыканком запрапанаваў райвыканкомам распачаць падрыхтоўчую працу. У працягу бліжэйшых 2-3 тыдняў павінна быць праведзена справаздачнасьць перад выбаршчыкамі аб працы сельсаветаў і райвыканкому.

Новыя сыраварныя заводы.

БАБРУЙСК, 26-VI. У наступным гаспадарчым годзе акруговы саюз сельска-гаспадарчай каапэрацыі намячае пабудаваць 5 буйных сыраварных заводаў для выпрацоўкі сыру на экспарт.

Пабудова заводаў будзе каштаваць да 15 тысяч руб. Заводы змогуць перапрацоўваць па 20 тыс. пудоў малака ў год.

Для здавальненьня мясцовага рынку малочнымі прадуктамі будзе арганізавана 10 сыраварных і 35 масларобных пунктаў.

Кінофікацыя вёскі.

БАБРУЙСК, 26-VI. З мэтаю пашырэньня кіно на вёсцы акруговы саюз спажывецкай каапэрацыі камандыраваў на чатырохмесячныя курсы кіномэханікаў у Маскву свайго прадстаўніка. На наступны год будуць вызначаны сродкі на кінофікацыю з бюджэту акрсаюзу.

Адчыняюцца курсы прыказчыкаў.

Бабруйск, 26-VI. 27 чэрвеня распачынаюць сваю працу акруговыя курсы прыказчыкаў вясковых каапэратываў. На курсах будуць выкладацца дысцыпліны: таваразнаўства, грамадазнаўства і вядзеньне загатовак. Ад кожнага спажывецкага таварыства камандыруецца на курсы адзін прыказчык.

Пабудова мясного камбінату.

Ворша, 26-6. У г. Воршы мяркуецца пабудова аграмаднага мясного камбінату. Дзяржгандальбел зрабіў умову з „Хладэкспэртам" у Маскве па пабудову камбінату. У хуткім часе выяжджаюць прадстаўнікі ад «Хладэкспэрту» інжынэры і тэхнікі ў Воршу, якія тут будуць працаваць у якасьці кіраўнікоў па падрыхтоўчай працы да пабудовы камбінату.

Курсы для настаўнікоў школ павышанага тыпу.

Гомель, 26-7. 7-га жніўня ў Гомелі адчыняюцца курсы для настаўнікаў школ павышанага тыпу. На курсы прыцягваюцца ў абавязковым парадку ўсе настаўнікі школ павышанага тыпу Гомеля і 42 чалавекі з раёну.

Пра падзелы працоўных земляробскіх гаспадарак.

Разгляд т. Вішнеўскім („Сав. Бел." № 141) майго артыкулу, зьмешчанага ў № 138 «С. Б.» «аб падзеле працоўных земляробскіх гаспадарак» я лічу нездавальняючым, ня вычэрпваючым усяго зьместу, крыху афіцыйным і крыху памылковым. Здараецца, што з гары незаўсёды выразна відаць, што дзеецца на дне. А чаму гэта так?

1) т. В. кажа, што „ніхто, перш за ўсё, не забараняў самаахвотных падзелаў і што дзяліцца па закону бяз суду можна, але падзелы гэтыя ня маюць юрыдычнае сілы». У абежніку-ж НКЗБ № 17 на імя райвыканкомаў (Бюл. СНК за 1927 г. № 1, ст. 21) сказана літаральна: «пастановай СНК БССР ад 10-IУ 25 г. забаронены добраахвотныя сямейныя падзелы і спынена іх рэгістрацыя райвыканкомамі». Значыцца, маё тлумачэньне аб тым, што гэта акалічнасьць зьяўляецца адной з прычын, штурхаючых насельніцтва ў зям. суд з іскамі аб падзелах, грунтоўнае.

2) „Перадача з народнага суду зямельным камісіям на разгляд спраў пра падзелы адной маемасьці двара калі трохі і павялічыла лік спраў зямельных камісій",—далей кажа т. Вішнеўскі,—«дык затое значна паменшыла наогул лік спраў пра падзелы, бо нар. суд меў іх вельмі многа, а цяпер зусім не разглядае. Зямельныя-ж камісіі ня дзеляць маемасьці ў недрабімай гаспадарцы і таму вырашаюць такіх спраў нямнога».

Тут ужо зусім незразумела: бо калі нар. суд меў справу аб падзелах вельмі многа і ўсе яны перайшлі ў зям. камісію, дык і ў апошній павялічыцца лік спраў не на «трохі», як здаецца т. Вішнеўскаму, а хутчэй што на „вельмі", бо ўсе тыя, хто раней зьвярталіся ў нар. суд, зьвяртаюцца ў зям. камісію. Такім чынам тлумачэньне маё аб тым, што другой прычынай павялічэньня іскаў аб падзелах у зям. камісіях зьяўляецца перадача іх з нар. судоў і зьмена 79 арт. ЗК, зноў такі грунтоўнае.

3. т. В—кі кажа, што «зямельныя камісіі ня дзеляць маемасьці ў недрабімай гаспадарцы і таму вырашаюць такіх спраў нямнога».

Здаецца, трэба лічыць гэтак: калі ня маюць права дзяліць, дык ня маюць права і вырашаць, але тут, трэба думаць, т. Вішнеўскі мае на ўвазе другую частку 2-ой увагі да 72 арт. Зям. Код. і толькі тыя справы, якія разьвязваюцца РЗК у станоўчым сэнсе, а мы разумелі наогул лік разглянаваных з тымі, якіх у станоўчым сэнсе вырашыць няможна.

Згодна п. 1 пастановы СНК (З. З. № 24 арт. 220) п. 3 артыкулу 73 З. К., старшыня ЗК хоць і мае права ня прымаць іску аб падзеле без наяўнасьці выключных выпадкаў, але каб унікнуць нездаволеньня, паракання і скаргаў сялянства, якое заўсёды дамагаецца, каб справу аб падзеле або выдзеле разьвязаў **абавязкова толькі суд**, і каб пазбавіць яго ад дарэмных стратаў на падачу скаргаў, паседзі ў акругу, у цэнтр і да пракурора,—уважлівы старшыня рэдка карыстаецца гэтым правам і не шкадуе часу на некалькі лішніх гадзін, каб толькі спрэчныя бакі, а таксама і іншае насельніцтва, вышлі з залі суду здаволенымі калі ня прысудам, дык хоць увагай свайго пралетарскага савецкага суду.

4) Надзяленьнем зямлёй членаў двара, якія жадаюць з яго выйсьці, трэба не «папярэдзіць падзел двароў», як зразумеў т. Вішнеўскі, але ажыцьцявіць неабходны выдзел, калі падзел лічыцца немагчымым.

«Зразумела,—дадае т. Вішнеўскі,—добра было-б надзяліць зямлёю ўсіх, хто жадае яе атрымаць, нажаль толькі, яе ў нас не хапае».

Вось тут дык я зусім ня меў і ў думцы ўсіх, а толькі членаў сялянскіх гаспадарак, якім неабходна выдзеліцца, але без зямлі. А што здавальняць іх хоць паступова магчыма, дык гэта можна бачыць з таго, напрыклад, што ў апошні час у працягу аднаго толькі чэрвеня ў зям. частку аднаго толькі РВК паступіла 26 заяў ад земляробаў з просьбамі аб вабраньні з іх карыстаньня непатрэбнай ім, як лішкі, часткі зямлі.

Калі-ж дадаць да гэтага, што ня ўсе лішкі зямлі ў паасобных гаспадарках праверены, дык сьцеражлівасьць т. Вішнеўскага, што зямлі ня хопіць на гэта, будзе дарэмнай.

Урэшце, т. В. лічыць, што «прадстаўленьне двару права абвяшчаць яго непадзельнасьць нічога ня дасьць, бо самім законам абвешчана непадзельнасьць **усіх двароў** з дапушчэньнем выключных выпадкаў». А мне здаецца, што яна дасьць вельмі многа; папершае, паменшыцца тая лёгкасьць і хуткасьць, з якою члены двара зьвяртаюцца ў зям. камісію за падзеламі, калі будуць ведаць, што на гэта трэба згода ўсяго двара і папярэдняе абмеркаваньне гэтага пытаньня з удзелам прадстаўніка с-савету і двох незацікаўленых бесстароньніх грамадзян; падругое, паменшыцца наогул судовая валакіта і, патрэцяе, што галоўнае, будуць падтрымоўвацца добрыя адносіны членаў двара паміж сабою, і такім чынам само насельніцтва будзе сьвядома падтрымоўваць і пільнаваць закон аб непадзельнасьці.

Што-ж датычэ заключэньня артыкулу т. Вішнеўскага, што «прыходзіцца лічыцца з умовамі жыцьця і быту», дык тут я не супярэчу, бо гэты пэўнік і быў асновай усяго майго артыкулу, але яшчэ і з тым, што трэба лічыцца ня толькі з адной літарай закону, але і з яго сэнсам.

ЯЗЭП СТРАТАНОВІЧ.

НАРОДНАЯ ГАСПАДАРКА ПОЛЬШЧЫ—ЯК БАЗА ДЛЯ ВАЙНЫ.

Надзвычайна вялікія выдаткі матар'яльных сродкаў у сучаснай вайне абумоўліваюць непасрэдную залежнасьць баявое магутнасьці арміі ад эканамічных рэсурсаў краіны наогул, і ад узроўню разьвіцьця некаторых сэктараў народнае гаспадаркі—асабліва. Таму, побач з баявой падрыхтоўкай арміі да вайны, набыла асабліваё значэньне ваенна-эканамічная падрыхтоўка краіны. Першым крокам у гэтай падрыхтоўцы зьяўляецца вучот эканамічных рэсурсаў і вытворчых магчымасьцяй краіны.

Разгляд народнае гаспадаркі краіны дае магчымасьць загадзя намеціць, якія вучасткі гаспадарчага фронту будуць у часе вайны адчуваць найбольшае напружаньне, якія патрабуюць падмацаваньняў з рэсурсаў па-за межамі краіны і дзе можа наступіць прарыў гаспадарчага фронту. З гэтага пункту погляду мы і разгледзім народную гаспадарку Польшчы, наколькі гэта будзе магчыма пры карыстаньні польскімі эканамічнымі выданьнямі.

Перш за ўсё трэба сьцьвердзіць, што народная гаспадарка Польшчы ў цэлым у першы-ж пэрыяд вайны будзе знаходзіцца ў надзвычайна напружаным становішчы. Сапраўды, даволі параўнаць даныя аб нацыянальным прыбытку Польшчы з данымі аб выдатках на польскую армію ў выпадку вайны, каб выказанае меркаваньне зрабілася відавочным. Нацыянальны прыбытак Польшчы польскімі эканамістамі вызначаецца ў разьмеры каля 3 мілярдаў даваенных руб.; выдаткі вайны ў працягу аднаго году павінны скласьці прыблізна такую-ж суму. Такім чынам, калі ўвесь нацыянальны прыбытак Польшчы быў-бы непасрэдна выдадзен на вядзеньне вайны, дык і ў гэтым абстрактным выпадку Польшча наўрад ці магла-б зьвесьці канцы з канцамі. Апрача таго вядома, што гаспадарчыя рэзэрвы, з якіх Польшча магла-б браць сродкі для пакрыцьця дэфіцыту, вельмі нязначныя; таму аспоўнымі крыніцамі, з якіх Польшча прымушана будзе браць патрэбныя фінансавыя і матар'яльныя сродкі для вядзеньня вайны, будуць заграніцныя рэсурсы—дапамога тых буйных капіталістычных дзяржаў, без падтрыманьня якіх Польшча не распачне вайны.

Пяройдзем цяпер да разгляду паасобных сэктараў народнае гаспадаркі Польшчы дзеля вызначэньня іх ролі ў забясьпечаньні матар'яльнымі сродкамі арміі ў выпадку вайны.

Сельская гаспадарка.

Польшча зьяўляецца пераважна аграрнай краінай (65 проц. насельніцтва займаецца сельскай гаспадаркай), і трэба было-б чакаць, што ў харчовых адносінах яна будзе знаходзіцца ў спрыяючых умовах. Аднак, з прычыны нізкага ўзроўню разьвіцьця сельскае гаспадаркі, Польшча ў важнейшых галінах сельскае гаспадарчае прадукцыі, а ўласна на хлеба-фуражу, мае дэфіцыт.

У мінулы час, як паказвае замежны гандаль Польшчы, дэфіцыт у хлебных і фуражных прадуктах нязначны. У часе вайны становішча павінна моцна абвастрыцца: тая частка насельніцтва, якая пойдзе ў шэрагі арміі, будзе ў часе вайны спажываць больш хлеба, чымся яна спажывала ў мірны час; выдатак фуражу (аўса) таксама значна павялічыцца; апрача таго, магчымая зацяжка вайны, разам з тым няўхільнае зьніжэньне сельска-гаспадарчае прадукцыі ў наступныя за 1-м годам вайны сэзоны выкліча неабходнасьць хлеба-фуражных рэзэрваў у 1-шы год вайны. Такім чынам, доля дастаўкі хлебных запасаў цывільнаму насельніцтву значна зьменшыцца. Водлуг польскіх разьлікаў*), пры арыентыроўцы на 2-хгадовую вайну—калі нормы спажываньня хлеба-фуражу насельніцтвам застануцца прыблізна на ўзроўні мірнага часу,—пшаніцы хопіць толькі на 8—9 месяцаў, аўса—на 6—7 месяцаў, жыта і ячменю—на 10—11 месяцаў. Такое становішча выкліча, з аднаго боку, бязмоўна, прымусовае з самага пачатку нармаваньне спажываньня і сурагатаваньня хлеба, і, з другога боку, необходнасьць увозу хлеба-фуражу з-заграніцы.

У больш спрыяючых умовах будзе знаходзіцца дастаўка іншых прадуктаў харчаваньня: бульбы, мяса, цукру і інш. расьлінных прадуктаў. Пералічаныя прадукты Польшча ў мірны час экспартуе, праўда, у параўнаўча нязначных разьмерах; таму належыць думаць, што, прынамсі, у пачатковы пэрыяд вайны дастаўка харчаваньня, за выключэньнем хлеба

Праверка--самакрытыка--кантроль мас

КАНКРЭТНАЯ ДЫРЭКТЫВА

У Гомелі народ сур'ёзны. Вывялася пры абсьледваньні, што Дзяржыцкі каапэратыў неправыдаў на поўкапейкі цану на пару панчох, адразу-ж гаспадар увяпяўся. Аргандаль прыслаў пакунак гэтага 4 паперкі. Прапанавалася паставіць пытаньне на пасяджэньні актыву, абгаварыць на сходзе пайшчыкаў, рэвізійнае камісіі і г. д.

Пытаньне ставілі, жвава абмяркоўвалі і ўсе адназгодна зрабілі вывад:— мы вясковыя неталковыя. Ня ўмеем працаваць, шкодны мы народ, кемся праваслаўныя, грэшныя мы.

Сяляне-пайшчыкі гаварылі, што гэта грэх невялікі, але трэба глядзець, каб на будучае больш сур'ёзных памылак ня было. Інакш справа не абыйдзецца паперкамі зьверху, самі пайшчыкі ў парадку самакрытыкі перагаворваюць працаўнікоў мясцовае каапэрацыі дзеньнямі.

Каб больш не зрабіць начылак, дзяржыцкія каапэратары паразышлі працаваць сур'ёзна. Памылак не дапускаць і дырэктывы выконваць дакладна.

А дырэктыў было шмат. Напрыклад, багатоўка другараднае сыравіны і розных адкідкаў. Тым больш што і ЦК РКП партыя на гэта напіраюць. Асабліва на майскім пленуме ЦК ВКП(б)Б. Там на гэтую тэму шмат гаварылі і пункты ў рэзалюцыі запісалі.

З шмат якіх відаў сыравіны і адходаў дзяржыцкія каапэратары зьвярнулі увагу на косьці. Валяюцца яны на палёх, а між тым райсаюз абяцае плаціць 28 кап. за пуд плюс 15 кап. за дастаўку. Агітнулі сялянства, прыгатавалі памяшканьне, (цяжкая гэта справа ў сельскім каапэратыве) і пачалі загатоўляць. У два тыдні закупілі 150 пуд. касьцей і накіравалі ў контору райсаюзу ў Хойнікі. Там заплацілі на цане 28 кап. за пуд, а за дастаўку ні капейкі не далі.

У райсаюзе на запытаньне каапэратыва адказалі, што 15 кап. меркавалася плаціць за дастаўку ў Гомель, а ня ў Хойнікі. Пасьля гутарак і скандалу Дзяржыцкаму каапэратыву заплацілі па 10 кап. за дастаўку ў Хойнікі.

Сам каапэратыў плаціў за правоз касьцей у Хойнікі па 15 кап.

Сяляне аднак менш 26 кап. за пуд не згаджаюцца везьці косьці ў Хойнікі. Выходзіць, што каапэратыў можа купляць у сялян пуд касьцей па 8 кап. Прастакоў, якія згадзіліся-б весьці косьці з Дзяржыч у Гомель па 15 кап. за пуд, да гэтае пары не знайшлося.

Сяляне выдзіўлены і адмаўляюцца разумець такія скачкі ў цэнах з 28 да 8 кап. Касьцей сабралі даволі, але цаной ніхто не здаволен. Успамінаюць поўкап. на панчохах і чакаюць, калі можна будзе пачаць самакрытыку дзеньнямі.

А пакуль што гавораць аб тым, што каапэрацыя ашуквае. Кулачкі гэтым становішчам вельмі задаволены і замацоўваюць свае пазіцыі «сумленных людзей».

Косьці, здаецца, ня экспартны прадукт. Касьцей у нас хапае (недарма ў некаторых нашых загатоўцаў імбы амаль мадзяныя).

Але калі з касьцямі так выходзіць, дык што будзе з загатоўкаю іншых відаў другараднае сыравіны? Дзе гарантыя, што каапэрацыйны апарат навучыцца даваць канкрэтныя зазначэньні і дырэктывы на месцы. Да якое пары людзі будуць гаварыць, што на памылках яны вучацца, а фактычна ня вучацца.

Гісторыя з загатоўкаю касьцей ня ніжэй па сваім значэньні, чым здарэньне з панчохамі. Аргандаль здолеў прыцягнуць да цаны панчох увагу ўсіх пайшчыкаў.

Ці ня трэба цяпер прыцягнуць увагу Гомельскага райсаюзу да пытаньня загатовак другараднае сыравіны. Бо дырэктывы аб спыненьні загатовак ня было. Яны зьяўляюцца і будуць зьяўляцца працай першаступовае вартасьці.

Гомельскім каапэратарам пара навучыцца даваць на месцы больш канкрэтныя дырэктывы і не рабіць надвоху мясцовым працаўнікам. Апошні—народ просты. Возьмуць і запрапануюць каапэрацыйным кіраўнікам праехацца на вёску і выканаць уласныя дырэктывы. Адмовіцца будзе нельга, а выканаць некаторыя ўласныя дырэктывы—бязумоўна, немагчыма.

Падумайце, таварышы з райсаюзу.

В. СТАНКЕВІЧ,

Гомель.

Камэрсанты канкуруюць.

У буржуазных краінах камэрсанты канкуруюць для таго, каб „задушыць" адзін другога.

Па прыкладу буржуазных камэрсантаў у нас распачалі канкурэнцыю Лысоў, Сапрыцкі і Буткевіч з аднаго боку і Талапіла—з другога боку. Справа была яшчэ ў 1926-27 г.

У нас, у Савецкай Беларусі, канкураваць яшчэ лягчэй, чым у буржуазных краінах: у нас селянін без асаблівых запатрабаваньняў. Яму толькі дай даволі тавараў. Ні ўпакоўкі, ні дастаўкі, ні якасьці ён не патрабуе. Купіць, а пасьля ўжо разважае што купіў дрэнна. Канкурэнты гэтае становішча абрахавалі.

Цэнтравесклад у асобе, добрай памяці, т. Талапілы, карыстаючыся вялікімі матар'яльнымі магчымасьцямі, узяў ды загатовіў 10 тысяч акучнікаў.

Па думцы навуковых эканамічнадасьледчых устаноў патрэбнасьць Беларусі ў акучніках не перавышае 3-х тысяч у год.

Талапіла—чалавек не навуковага пакрою, але лепш ведаў, што рабіць. Ён меў на ўвазе адно: закупіць 10 тысяч акучнікаў і «накарміць», як кажуць, акучнікамі сялян, каб Белсельсаюз і азірнуцца не пасьпеў. А Белсельсаюз таксама не абы што: бяз хітрасьці, толькі грашыма яго ня возьмеш.

Стандартны камітэт у свой час вызначыў дакладны акрэсьлены тып акучнікаў. Інакш нельга. Ня вызначыш—кожны пачне выдумваць свае акучнікі і ў выніку — ня будзе чым на полі працаваць.

Белсельсаюз, з прычыны выключнага выпадку, як кажуць, «пренебрег» гэтаю пастановаю стандартнага камітэту. Ён рашыў так: арыгінальны замысел, арыгінальны павінен быць акучнік і закупіў 3 тысячы надзвычайна арыгінальных акучнікаў, якіх беларускі селянін ніколі ў жыцьці ня бачыў. Казьлі, што акучнікі настолькі выгадныя для ўмоў і матадаў вядзеньня беларускай сельскай гаспадаркі, што больш выгадных ніхто ня прыдумае: хоча селянін—працуе, залажыўшы каня, абрыдае канём — можа залажыць жонку.

Белсельсаюз ня мог разьлічваць на новыя імкненьні беларускага селяніна. Адкуль яму ведаць, што селянін ужо хоча араць трактарам?..

Вышла дрэнна.

У выніку „канкурэнцыі" звыш 10000 акучнікаў і сёньня ляжыць на складах у Менску.

А Лысоў, Сапрыцкі, Буткевіч і Талапіла, пасьля таго, як РСІ вынесла на гэтым пытаньні сваю пастанову, зьдзіўлена, дружным квартэтам гукнулі:

— Каб-жа гэта раней ведалі...

Сёма.

Не каапэратыў, а хэўра п'яніц.

Калі чужы чалавек зойдзе зьнячэўку ў наш каапэратыў, то яго ашарашыць як выгляд усяе крамы, так паводзіны з пакупцамі і непатуральна вясёлыя твары нашых каапэрацыйных «бацькоў»: Крамніка Язэпа Сушкевіча і рахункавода Вэйцмана. Старшыня праўленьня Пікулік—чалавек больш «культурны» і пры людзях ня п'е гарэлку, як гэта робяць яго менш «сьвядомыя» таварышы Вэйсман і Сушкевіч, якія пакідаюць цэлую краму пакупцоў чакаць, а самі накіроўваюцца балявацъ у бакоўку. Затое-ж Пікулік спаганяе ўсю сваю злосьць на цукерках і інш. сладачах аж пыл курыць, калі шляхетны старшыня ня зусім шляхетна хрумстае цукеркі і вялікія кавалкі рафінаду.

— Паважацца людзей: — скажыце вы,—дык хто гэтага баіцца ў Раваніцкім каапэратыве?

Людзі гэта—адно, а праўленьне каапэратыву—рэч іншая, і што дазваляецца другім, не дазваляецца першым. Напрыклад, панядзелак, калі ў краму больш усяго зьбіраецца пакупцоў, то Сушкевіч у першую чаргу прадае найбольш улюбёныя і сымпатычныя яму тавары, і ў першую чаргу «рускую горкую», а ўсе іншыя пакупцы, якія па розных прычынах ня хочуць ці ня могуць купляць гарэлку, павінны чакаць да самага вечара, пакуль не задаволяць смагу ўсе аматары выпіўкі.

— Можа-ж пачакаць,—з пыхаю заўважыць Сушкевіч якой-небудзь кабеце, якая такі ня ўцерпіць і залямантуе, каб ёй далі фунцік ці са два солі.

Гэтымі днямі праўленьне так напілося, што ня трафіла добра замкнуць дзьверы ад каапэратыву, і зладзеі, якія цікавалі за п'яніцамі, улезьлі ў каапэратыў яшчэ да зьмярканьня і забралі ўсю гатоўку з касы. Толькі праз некалькі дзён рэвізія ўстанавіла, што не хапае 355 руб., а колькі ў сапраўднасьці ўзята зладзеямі—невядома, але нашы каапэратары ўсе свае недачоты могуць зараз узваліць на зладзеяў.

Кожны пайшчык добра ведае, што пакража гэта выклікана пастаяннымі п'янкамі Сушкевіча і Вэйсмана, што разбэшчанасьць гэтых працаўнікоў і самавольства ў адносінах да сваіх абавязкаў штурхае на шлях злачынства розны праступны элемент.

— Чаму ім можна, а мне не,—можна часта пачуць ад аматараў чужой уласнасьці. У скутку такой чыннасьці Сушкевіча і Вэйсмана мы мелі апошнюю пакражу (а можа часткова і растраціў).

Усе падобныя надзеі ў нашым каапэратыве не зьяўляюцца выпадковымі. Гэта хранічная і застарэлая хвароба, на якую хварэе амаль кожны склад новага праўленьня.

А чаму гэта так? Таму, што наша каапэрацыя вельмі далёка ад уплыву партыйнай арганізацыі. У нас не бракуе сумленных камсамольцаў, якія добра змогуць спраўвіцца з працай, не кампрамэтуючы савецкую ўладу і грамадзкую арганізацыю.

Мы патрабуем у гэтай справе суровага сьледзтва, трэба з карэньнем вырваць злачынствы растрат і пакраж. Трэба тут-жа ў сельсавеце наладзіць паказальны суд над гэтымі злачынцамі, каб і другім ня было спагадна гэта рабіць.

Раваніцкі.

(Раванічы, Чэрвеньскі райён).

Адмоўнасьці мінулай і сучаснай кампаніі па вярбоўцы моладзі ў ваенныя школы.

Цэнтральная вярбовачная камісія па ўкамплектаваньні ваенных школ сёлета пачала сваю працу з падлічэньня адмоўнасьцяй мінулага 1927 году.

Заўважана, што ў леташнім годзе перашкодамі для ваенных школ атрымаць самы найлепшы склад моладзі былі наступныя зьявішчы:

а) недастатковае ўцягненьне ў працу вярбовачных камісій прадстаўнікоў партыйных, камсамольскіх і прафэсыйных арганізацый, прадстаўнікоў асьветы; адгэтуль перагружанасьць нямногіх актывістаў у гэтай справе, а ў выніку таго і другога—памылкі, недагляд і адбітак на ўсёй працы адбору кандыдатаў у школы;

б) другой нашай заўвагай было слабае разгортваньне кампаніі ў нізавых арганізацыях і прамысловых прадпрыёмствах; гэта зьявішча выклікала тое, што вярбовачныя камісіі атрымлівалі неправераны матар'ял, яны ў зьвязку з гэтым павінны былі займацца чарнавой працай, мала аддаючы ўвагі сталай працы па арганізацыі набору;

в) акруговыя вярбовачныя камісіі не ўтварылі поўнага ахопу рабоча-сялянскай моладзі. Апошняя шырокай хваляй хлынула паміма вярбовачных камісій. Цікава тое, што сярод той моладзі, якая праз галовы акруговых вярбовачных камісій зьвярталася ў Цэнтральную вярбовачную камісію, альбо непасрэдна ў школу, знаходзілася да 60 проц. сяброў і кандыдатаў кампартыі і ЛКСМ, а таксама каля 34 прац. рабочых;

г) адмоўнасьцю было і тое, што ў школы часта пасылаліся слаба падрыхтаваныя ня толькі з боку агульнаасьветнага і палітычнага, але фізычнахворыя кандыдаты;

г) вельмі слаба былі распрацаваны і арганізаваны заняткі па падрыхтоўцы вылучаных кандыдатаў. Вось чаму школы, сустракаючыся з непадрыхтаваным кантынгентам моладзі, апынуліся ў цяжкім становішчы ў справе ўкамплектаваньня школ.

Важную ролю ў справе вярбоўкі моладзі адыгрывае, вядома, агітпроп.-праца. Як мага шырэй і паўней патрэбна было папулярызаваць сетку ваенных школ, правілы прыёму, ролю і значэньне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі і яе каманднага складу, як найшырэй патрэбна было скарыстаць друк.

Пры падвядзеньні вынікаў мінулага году з боку крытыкі магчыма было зазначыць, што шмат чаго было зроблена, але ня ўсё. Фармальнае выкананьне абавязкаў і казённае задавальненьне ўсім вярбовачным камісіям у гэтай справе зусім не да твару. І зараз узьнікае небясьпека за правядзімую працу па падбору і падрыхтоўцы моладзі ў школы. Акруговыя вярбовачныя камісіі, пакуль што на дзіва паволны і марудны ў сваёй працы. Кампанія ва ўсю патрэбную шырыню яшчэ на мясцох не разгорнута. Арганізацыйны бок пытаньняў, праўда, атрымаў у большасьці выпадкаў сваё вырашэньне да самых першапачатковых арганізацый. Але-ж гэта далёка ня ўсё. Вярбоўка, падбор і арганізацыя падрыхтоўкі не набылі неабходнага тэмпу, які-б забясьпечыў посьпех к належнаму часу. Час вельмі абмежаваны; у першай палове верасьня справу патрэбна будзе ўжо разгортваць і да 15 верасьня напраўляць моладзь, як-бы яна ні была падрыхтавана, у школы.

Акруговыя вярбовачныя камісіі павінны значна паўней, чым у леташнім годзе, скарыстаць друк. А між іншым да гэтага часу наглядаецца, што сёлета слабей асьвятляюцца пытаньні вярбоўкі, чым у леташнім. Калі да гэтага дадаць яшчэ несыстэматычнасьць і раздробленасьць матар'ялаў, то ёсьць падставы трывожыцца за спрыяючыя выніку ўкамплектаваньня ваенных школ наогул.

Адначасова дарэчы зьвярнуць увагу і рэдакцыям нашых газэт, якія матар'ялы, пасылаемыя хоць-бы ад цэнтральнай вярбовачнай камісіі, зьмяшчаюць, але з даволі вялікім спазьненьнем. Здараецца, што артыкулы, пасланыя пазьней і ў разьвіцьцё папярэдніх, зьяўляюцца раней. Такім чынам, зацікаўленыя ў гэтых матар'ялах ня маюць магчымасьці імі карыстацца як сьлед. Вялікім недахопам сучаснай працы зьяўляецца пасыўнасьць мясцовых арганізацый, Наркамасьветы, прафарганізацый і некаторых камсамольскіх арганізацый.

Апроч усіх адначаных адмоўнасьцяй арганізацыйнага парадку, цэнтральная вярбовачная камісія БССР па матар'ялах, якія атрымліваюцца ад акруговых вярбовачных камісій, заўважвае шэраг адмоўнасьцяй тэхнічнага напрамку. Так, шмат якія вярбовачныя камісіі абмяжоўваюць сваю працу па прыёму заяў тым альбо іншым тэрмінам. А тым часам гэта праца не павінна супыняцца да самага прыёму ў ваенныя школы. Наглядаецца неправідловая інфармацыя аб умовах прыёму ў школы: гранічны ўзрост замест 22 год уключна бярэцца ў 21 год, часамі ў 23 гады, а мінімальных замест 18, 17 год. У пералікаў ваенных школ часамі ўпамінаюцца ваенна-палітшколы і школа мэханічнай цягі; трэба мець на ўвазе ў далейшым, што першых школ зусім няма, а ў школу мэханічнай цягі прыёму ня робіцца. Сустракаюцца часамі і іншыя недарэчнасьці.

Усім вярбовачным камісіям неабходна ўлівіць патрэбу завастрэньня ўвагі на ўсіх трывожных момантах, згуртаваць увагу і як мага хутчэй і паўней асьвятляць у друку.

А. Сташэўскі.

„Мы вам падлічым"

(Падатковы малюнак).

Пасьля гаму, крыку, тлуманіны,—сход адчыніўся.

— Ну, таварышы, пачнём,—паведаміў старшыня сходу.

— Пачынайце. Зачым час марнаваць.

Невялічкі даклад аб новым законе па с.-г. падатку. Некалькі запытаньняў і «ацыйная» частка скончана.

Пачынаецца самы „цымус"...—Беднята павінна быць зацікаўлена ў выкрыцьці маемасьці кулакоў. Грамадзяне, захаваўшыя аб'екты, будуць строга пакараны... З напамінаньнямі, з папярэджваньнямі расквітаюся. Першым апытваецца Сяргей.

— Колькі зямлі?—Сенажаці?—Коняй?—Кароў?—Сьвіней? Правідлова паказаў гэты грамадзянін аб сваей гаспадарцы. Задае старшыня пытаньне ўсяму сходу.—Правідлова. Адказваюць некалькі галасоў.

А вось выклікаюць чалавека „з быўшых".—Коняй пара,—кароў...—адна... сьвіней няма...

— Няпраўда!.. Няпраўда...—загудзела грамада Кароў у яго тры... Сьвіней шасьцёра, ды неземляробчых прыбыткаў дзьве сотні рублёў. А зямлі ў яго ня пяць дзесяцін, а трынаццаць!..

«Быўшы» ня ведае, што рабіць...

— Няпраўда, браццы, няпраўда,—апраўдваецца ён. Кароў я прадаў... Сьвіньні падохлі... Зяцю завёў кароў, а сьвіней у хмызьняк затурыў.

На «быўшага» складваецца пратакол. Сход працягваецца далей.

Апытваецца другі «махавік». Выкручваецца і так і гэтак ён, але не памагае. Беднята кажа:

— Вы, заможнікі, ня ўмеесце лічыць. Мы вам дапаможам. Мы вам палічым.

Вечарам камісія падлічвае.

— Так, павялічэньне маем,—кажа старшыня камісіі:—во, паглядзі, наколькі супроць мінулага году больш выкрылі. Зямлі 217 дзесяцін, пахаці 121 дз., а неземляробчых прыбыткаў каля трох тысяч.

Так прайшоў сход сялян па вучоту аб'ектаў у в. Робцы, Расьнянскага райёну па Аршаншчыне.

Цім. Рублёў.

Выканаць дырэктыву ўраду.

20-ціпроцантнае зьніжэньне выдаткаў.

ГОМЕЛЬ, 26-6. Гомельская РСІ заканчвае абсьледваньне 20 проц. зьніжэньне адміністрацыйна-гаспадарчых выдаткаў. Выяўлена, што ў некаторых арганізацыях маюцца вельмі кепскія вынікі. На цьвіковым заводзе—„Інтэрнацыянал" у Рэчыцы замест зьніжэньня выдаткаў, вышла павышэньне. Так, напр., гадавы каштарыс складзен у суме 26 тысяч руб., а выдатак за 1-ае паўгодзьдзе склаў 25 тысяч руб.

Большасьць прадпрыёмстваў перавысіла зацьверджаныя РСІ і ВСНГ каштарысы: напр., ка гарбарні «Пралетарскі шлях» каштарыс першага паўгодзьдзя перавысіў на 4 тысячы руб., на заводзе «Пралетары»—6500 р., фабрыцы «Везувій»—11 тысяч руб., на фабрыцы «Днепр»—16 тысяч руб. «Двигатель революции»—900 р., на фабрыцы абутку «Праца»—на 4 проц., на прадпрыёмствах Лесбелу—40 проц.

Кіраўнікі прадпрыёмстваў, ня гледзячы на ўсю рэальнасьць дырэктывы, не зьвярталі на гэта пытаньне належнае ўвагі. У некаторых установах кіраўнікі шукалі «выхаду», каб абмінуць пастановы ўраду. РСІ прыходзілася капацца ў матар'ялах установ, выклікаць кожнага гаспадарніка і дакаваць у кожным паасобным выпадку наколькі мотазгодны і неабходны той ці іншы выдатак.

Калегія АКК-РСІ, абмяркоўваючы вынікі абсьледваньня, абвясьціла дырэктару заводу «Інтэрнацыянал» у Рэчыцы т. Зеленкоўскаму выгавар, дырэктару заводу „Пралетарыскі Шлях" тав. Хайкіну зрабіла заўвагу, дырэктару заводу «Пралетары» таварышу Рабіновічу—выгавар, ранейшаму дырэктару фабрыкі „Днепр" т. Коўшэнаму-выгавар. Апрача таго, калегія РСІ, улічваючы, што Белмэталёгандаль няўважліва адносіўся да разгляду каштарысу заводу, пастанавіла ўзьняць пытаньне перад НК РСІ БССР аб прыцягненьні да адказнасьці кіраўнікоў трэсту. Бухгальтару завода «Інтэрнацыянал» за пасыўныя адносіны да пытаньняў зьніжэньня выдаткаў, таксама абвешчан выгавар. Адначасна прапанавана дырэкцыі заводу «Інтэрнацыянал» перагледзець склад бухгальтэрыі.

Запалкаваму трэсту запрапанавана скараціць выдаткі па камандыроўках. Дырэктару заводу «Пралетары» даручана перагледзець штат тэхнічнага пэрсаналу, у першую чаргу бухгальтэрыі.

Усім абсьледваным прадпрыёмствам прапанавана дапасоўвацца да зацьверджаных каштарысаў і дамагчыся вярнуць тое, што перавыдадзена ў першым паўгодзьдзі. Выкананьне дырэктывы гаспадарнікі павінны распачаць неадкладна, высоўваючы гэтае пытаньне на шырокае абмеркаваньне рабочых і служачых.

Калегія РСІ, улічваючы, што маюцца выпадкі адсталасьці бухгальтэрыі, прапанавала кіраўнікам устаноў ужыць захады да зьнішчэньня запушчанасьці, звальняючы вінаватых асоб з пасады і прыцягваючы іх да адказнасьці.

Тав. Нартовіч надумаў.

(Менская акруга).

Сяляне в.в. Аксанаўшчына, Дзьвіняцкі, Вялікае Сяло і іншыя прылягаючыя да іх, даўно марылі аб арганізацыі малочнай арцелі. Па агульным жаданьні сялян гэтых вёсак 8 лютага с. г. на прапанове памоцніка раённага агранома, т. Акімава, яны згадзіліся далучыцца да Гутнянскай малочнай, у сабе-ж адчыніць толькі зьліўны пункт. Праўленьне Гутнянскай малочнай дацамагло новым пайшчыкам, даўшы ім бакі для малака, а потым, каб скараціць расходы на дастаўцы, дало сэпаратар. Усё было добра і ўсе былі рады, але не надоўга.

Пасьля ўсяго гэтага старшыні камітэту ўзасмадапамогі Траскоўскага сельсавету, т. Нартовіч, прышла, трэба сказаць, дрэнная думка—арганізаваць яшчэ адну малочную арцель пад самым носам Гутнянскай арцелі. Нікому не ведома, хто і якім чынам дазволіў гэта зрабіць. Быў дадзен крэдыт у 2000 руб., за які і было закуплена абсталяваньне, але трэба сказаць, што гэта было зроблена прафанамі ў гэтай справе. Так, закуплены сэпаратары, які пераганяе ў гадзіну 50 вёдраў малака, між тым як у нас і за дзень ня зьбіраецца гэтулькі. Трэба сказаць дапамогі, трэба шукаць людзей, якія-б выратавалі ад доўгу ў 2000 р. І цяпер старшыня новай малочнай, якая носіць назву «Горанскай», бо сам старшыня з Горань, т. Нартовіч насядае на праўленьне і пайшчыкаў Гутнянскай малочнай спыніць перагон малака, а аддаваць яго новай арцелі, якая толькі пачала працаваць і працы якой ніхто ня бачыў і ня ведае. Пытаньне: ці патрэбна гэта было кідаць на вецер 2000 руб.?

Н.

За штучнае павышэньне цэн.

Управа Белдзяржгандлю, у асобе тав. Шэйніна, парушыла дырэктыву аб забароне прымусовай продажы нехадавых тавараў. Гэтым штучна павышаліся цэны на тавары.

Старшыня праўленьня Белпайгандлю тав. Луцкевіч не рэагаваў на гэта, а наадварот, пераносіў страту па гэтых таварах на сабекошт іншых тавараў, што прывяло да павышэньня цэн у сярэднім на 2,7 проц.

НК РСІ абсьледаваў гэту справу і ў будучым даручыў Белдзяржгандлю вінаватых зараз-жа прыцягваць да судовай адказнасьці.

Праўленьне ЦРК прызнана вінаватым у валакіце.

Згодна пастановы эканамічных органаў Белсельсаюз павінен быў зрабіць дагавор з МЦРК на дастаўку апошняму масла. Маючы на ўвазе гэты дагавор, Белсельсаюз падрыхтаваў для МЦРК 1000 кілёграмаў масла.

МЦРК адцягваў заключэньне дагавору і масла Белсельсаюзу сапсавалася, чым зроблена значная страта.

НК РСІ прызнаў праўленьне МЦРК вінаватым у стварэньні валакіты і справу перадаў у пракуратуру на дасьледваньне.

ЦЭНТР БУДУЧАГА ІНДУСТРЫЯЛЬНАГА ПАЛЕСЬСЯ*)

(Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

БАРАКАЎ—У КВАТЭРЫ.

Адна асаблівасьць выгодна выдзяляе Гомель з іншых гарадоў Беларусі. У Гомелі вельмі мала ад старога, ад эпохі непасрэдна далучаемае да сярэднявякоўя. Пляніроўка гораду настолькі простая, што нельга ўбачыць цеснаты. Вуліцы простыя і шырокія. Перад вачыма адчыняецца прастор. Царквы, мэчэці і сінагогі амаль ня прыкметны. Гэтых „пакаянных" дамоў паклоньня мала і яны не выдзяляюцца серод іншых будынкаў.

Даваеннае разьвіцьцё Гомелю прыйшлае на апошняе дваццацігодзьдзе пасьля вайною. Таму ў Гомелі мала стар'я. Сапраўдны рост і разьвіцьцё Гомелю адносіцца да пэрыяду пасьлярэвалюцыйнага. Таму яшчэ цяпер пават у цэнтры гораду можна сустрэць побач дасканалай камяніцай, дажываючую свой век драўляную халупу.

Гомель ужо некалькі гадоў з посьпехам вядзе сваё будаўніцтва. Кватэрнае будаўніцтва было разгорнута яшчэ ў пачатку губэрні ў 1925 годзе. Пасьля раённаваньня будаўніцтва ня спынілася (як некаторыя гадавалі), але, наадварот, яшчэ больш пасьпешлася. Аднак, абсалютны рост жыльлёвае плошчы адстае ад прыросту насельніцтва. Норма на аднаго чалавека ў 1927 г. менш, чымся ў 1924 г. Гэта ня гледзячы на тое, што шэфскія памяшканьняў, занятых раней гарадскімі ўстановамі, адышлі цяпер у рабочыя кварталы. У гэтым можна бачыць толькі новы дакад, што горад расьце.

У кватэрным будаўніцтве, як і ва ўсей гаспадарчай чынпасьці, у акрузе адзначаецца станоўчая рыса. Тут Акружком вядзе курс не на распылень-не сродкаў па дробязях. Наадварот, дробныя сродкі з розных крыніц канцэнтруюцца і выкарыстоўваюцца на капітальнае будаўніцтва. Гэта павялічвае эфэкт, дае нячуваныя вынікі.

У чыгуначным пасёлку «Красный Октябрь» мне давялося бачыць баракі, у якіх некалісь жылі і цяпер часткова жывуць рабочыя сем'і. Больш таго, жылі нават у зямлянках. Кантраст настолькі значны, што зьдзіўленьню няма граніц, адначасова бачыш два сьветы. Барак сваімі вокнамі-дзюркамі, усім сваім выглядам цягне назад у мінулае. Сымбал нявольніцтва, прыгнечаньня і атупеньня адчуваецца ў гэтым першабытным жыльлі. Далёкімі пячэрнымі часамі вее ад яго і, здаецца не чалавек, а старажытны прапрадзед з моцна разьвітымі сківіцамі і прыплюснутым чалом сяліўся тут.

Але хоць барак і выглядае страшыдлам, усё-ж ён зусім нязначны сярод сотні новых будынкаў, дзе дасканалыя сьветлыя кватэры і шмат сонца і паветра. У пасёлку «Красный Октябрь» відаць, як сапраўды чалавечыя кватэрныя ўмовы дазваляюць выхоўваць новага чалавека, дапамагаюць зьнішчэньню нявольніцкіх прывычак у быце і працы.

Нанова пабудаваныя рабочыя пасёлкі ў Гомельскай акрузе заслугоўваюць выключнае ўвагі. Яны ёсьць у Гомелі—«Красный Октябрь», у Нова-Беліцы—„Путь к социализму", у Рэчыцы—«імя Фрунзэ», у Добруші—пасёлак паперніку. Апошні пасёлак па сваіх природных умовах і разьмеркаваньні напамінае дасканалыя дачы. У Беларусі вы нідзе ня знойдзеце такога пасьпяхоўнага рабочага кватэрнага будаўніцтва, карэнным чынам мяняючага бытавыя ўмовы рабочых.

У гэтым годзе на новае кватэрнае будаўніцтва намечана патраціць 704 т. рублёў. Заходнія чыгункі і «Беламес» са свайго боку ўкладаюць 400 тыс. р. На капітальны рамонт выдаецца 180 т. рублёў. Выдаткі на кватэрнае будаўніцтва ў гэтым годзе трохі вышэйшыя. Усяго ў гэтым годзе будуецца новых камяніц на 136 кватэр і дабудоўваецца 82 пачатых у леташнім годзе. Драўляных кватэр дабудоўваецца 176 і новых будуецца—44.

Становішча ў будаўніцтве ў гэтым годзе ў Гомельшчыне выключна добрае. Будаўнічыя матар'ялы былі загатоўлены загадзя. Справа дайшла да таго, што з Бранску і Кіеву прыяжджаюць сюды з надзеяй купіць тут будаўнічыя матар'ялы: бэлькі, цэглу і аліфу.

Работы пачаліся своячасова, а гэта для Беларусі ў сёлетнім годзе выключэньне.

Зараз на пабудове ў Гомелі занята больш 2000 чал.

Кватэрнае будаўніцтва ў Гомелі таньней, чымся ў іншых гарадох Беларусі на 10-15 проц. Гэта бяз 15 проц. зьнішэньня, якое трэба ў гэта лета правесьці.

Не абышлося і без недахопаў. Але яны характэрны для мінулага году.

Мясцамі было кепска з будаўнічай дысцыплінай. Зацьверджаныя праэкты не захоўваліся, матар'ялы выдаткоўваліся звыш нормы, лесаматар'ялы былі сырыя. Апошняе прыводзіла да таго, што праца была ня зусім добраякаснай. Зімовы сэзон, як падрыхтоўчы час, слаба выкарыстоўваўся.

Недахопы бачаць ня толькі будаўнічыя арганізацыі і кіраўнічыя ўстановы акругі. Рабочая маса іх уяўляе вельмі дэтальна. Кіраўнікоў будаўніцтва крытыкуюць грунтоўна і не бяз посьпеху. Будаўнічы сэзон гэтага году ад шмат якіх памылак мінулых гадоў пазбавіўся.

У кватэрным будаўніцтве пры ўсіх недахопах дасягнута шмат станоўчых вынікаў. Ня бачыць гэтага і не павучыцца ў гомельчан могуць толькі людзі, для якіх мясцовы патрыётызм важней асноўнае задачы краіны.

КАМЕНЬ ЦІ ДРЭВА.

Атавізмам для Гомеля зьяўляюцца тыя драўняныя халупы, якія далучыліся да камяніцаў. Нярыглядныя хаткі займаюць месца і перашкаджаюць разгортваньню працы. Сёлетнім летам пачалі ліквідацыю халупаў. Яны руйнуюцца і на іх месцы закладаюць 3-4-хпавярховыя будынкі.

Узят курс на буйнае будаўніцтва камяніцаў. Толькі ў Беліцы, Добрушы і Рэчыцы будзе праводзіцца драўнянае будаўніцтва. У самым Гомелі дзяржаўнага і каапэрацыйнага драўнянага будаўніцтва амаль што ня будзе.

Сур'ёзна стаяла пытаньне, дзе будавацца. Ці пашырыць мяжу гораду і новае будаўніцтва весьці на акраінах, ці зьмяніць твар цэнтральнае часткі гораду. Перамог апошні пункт гледжаньня. Ён станоўчы і тым, што цэнтр гораду больш хутка арабочваецца. Новабудуемая камяніца для чыгуначных рабочых ня толькі наблізіць апошніх да жыцьця гораду, звычайна заўсёды адарваных ад яго, але і павялічыць у цэнтры гораду лік жыхара-рабочага.

Будаўніцтва значна павышае ўпарадкаваньне гораду. Дом акрыванкому на 70 кватэр, пачаты пабудовай у гэтым годзе і дом гарсавету на 66 кватэр, які ўжо дабудоўваецца, ня толькі забясьпечаць рабочых кватэрамі, але і зробяць горад больш прыгожым.

Аднак становішча з упарадкаваньнем застаецца паранейшаму цяжкім. У гэтым годзе, на ўпарадкаваньне выдаецца толькі 50 тыс. руб. Сума вельмі мізэрная для такога гораду.

Але ўсяго адразу ня зробіш. Важна тое, што самае галоўнае, патрэбнае робіцца з посьпехам. А ўпарадкаваньне ўжо ў будучыя гады пасунецца наперад.

З мерапрыёмстваў па ўпарадкаваньні зьвяртае ўвагу забрукаваньне вуліц клінкерам.

Дзьве вуліцы Камсамольская і Савецкая забрукоўваюцца асобнаю шчыльнаю цэглаю.

Апрача таго, што гэта дасьць вялікія выгады для гарадзкога руху, мы будзем мець у Беларусі першы выпадак, калі брук гораду (пакуль што 2 вуліцы) ня будзе горшым за брук Масквы і Ленінграду.

КЛІНЦОЎСКАЯ ДАЛЬНАВІДНАСЬЦЬ.

У момант ліквідацыі губэрні многія думалі, што з далучэньнем да Беларусі ня толькі спыніцца жыцьцё ў горадзе (будзе менш служачых), але і буйная дзяржаўная прамысловасьць не атрымае належнага разьвіцьця. У «сялянскай» Беларусі могуць забыць пра прамысловасьць. Так думалі абываталі, яны заўсёды чаго-небудзь ды баяцца. «А вдруг» і «авось» характэрна ў першую чаргу для абываталяў. Заразіліся гэтымі страхамі асобныя спэцыялісты і працаўнікі прамысловасьці.

Выключэньне складалі працаўнікі Клінцоўскага трэсту. Яны думалі і зусім разумна, што калі Беларусь і «сялянская краіна», дык пасьля далучэньня да яе, увага да дзяржаўнае прамысловасьці будзе яшчэ большая. На справе яно так і вышла. Клінцоўская дальнавіднасьць апраўдалася на ўсе 100 проц. Паспрабуйце цяпер сказаць, што з Назарэту ня можа быць нічога добрага.

Вышэй мы падавалі лічбы капітальных выдаткаў на мясцовую гаспадарку ў гэтым годзе. Для Гомельшчыны яны зьяўляюцца рэкордныя. З рэспубліканскай прамысловасьцю справа стаіць яшчэ лепш. З агульнае сумы капітальных выдаткаў па акрузе ў гэтым годзе ў 7 млн. 616 тыс. руб. у рэспубліканскую гаспадарку ўкладаецца 4 млн. 151 тыс.

Капітальныя затраты па прамысловасьці раўняюцца 4 млн. 275 тыс. руб. З іх па рэспубліканскай—2 млн. 724 тыс. руб., па мясцовай прамысловасьці 766 тыс. руб., і па камунальных прадпрыёмствах 785 тыс. р.

Пераабсталёўваецца і пашыраецца Добруская папяровая фабрыка. Праводзіцца замена і абсталяваньне лесазаводаў. На заводзе «Пролетарий», будуецца новы кацельны цэх. Намечана да мэханізацыі фабрыка «Везувій». Заканчваецца пабудовай новая запалкавая фабрыка «Днепро». Пашыраецца адзіны ў Саюзе па характары вытворчасьці завод «Красный Химик».

Далейшае пералічэньне можа прытаміць чытача. Але што робіцца ў прамысловым будаўніцтве—не прытамляе энэргіі рабочых мас. Яна штодзень расьце разам з ростам колькасьці рабочых Гомельшчыны, разам з рухам наперад, які адчуває акруга пасьля далучэньня да Беларусі.

Гордасьцю Гомеля трэба лічыць нов

Аб становішчы Віцебскае парт-арганізацыі і рабоце Акругкому.

Пастанова бюро ЦК і прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б 18 чэрвеня 1928 г.

Адзначаючы, што Віцебская арганізацыя КП(б)Б у цэлым зьяўляецца здаровай, моцнай і бальшавіцкі вытрыманай партыйнай арганізацыяй, Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦКК разам з тым канстатуюць, што ў Віцебскай арганізацыі мела месца разлажэньне некаторых асобных членаў партыі і беспартыйных савецкіх і гаспадарчых працаўнікоў і шараг буйнейшых арганізацыйных недахопаў у кіраўніцтве савецкім, прафсаюзным і гаспадарчым апаратам. Разам з тым Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦКК канстатуюць, што з боку Віцебскага акругкому: а) ня было дастатковага палежнага кіраўніцтва савецкай і гаспадарчай работай праз фракцыі саветаў, а таксама ня было ўдзелена дастатковай увагі кіраўніцтву масавай работай саветаў; б) ня было дастатковай праверкі кіраўніцтва з боку Акрвыканкому гарсаветамі, райвыканкомамі і сельсаветамі; в) ня было дастатковага кіраўніцтва прафсаюзамі праз АСПС, што прывяло да паслабленьня самога АСПС; г) ня было ўдзелена дастатковай увагі на вывучэньне і зьнішчэньне хваравітых зьяў у КСМБ, а таксама, ня былі ўстаноўлены правільныя ўзаемаадносіны паміж Акругкомам і Акруговай Кантрольнай Камісіяй, што выявілася ў недаацэнцы ролі кантрольнай камісіі з боку Бюро Акругкому.

Разам з тым Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦКК указваюць, што АКК сваячасова на ставіла ў ЦКК і ЦК пытаньняў аб меўшых месца ненармальнасьцях ва ўзаемаадносінах Акруговай Кантрольнай Камісіі і Акругозага Камітэту.

Усе гэтыя недахопы ў рабоце Віцебскага Акругкому паглыбляліся: а) нездавальняючым правядзеньнем унутры партыйнай дэмакратыі; б) нездавальняючай арганізацыяй масавай работы; в) нездавальняючым кіраўніцтвам «трэугольнікам» на прадпрыёмствах (ячейка, фабзавмясцком, адміністратар); г) недастатковай калектыўнасьцю ў рабоце Бюро Акругкому і д) недапушчальнай мягкасьцю з боку Акругкому да асоб, якія сваявольнічалі.

Выходячы з гэтага Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦКК пастанаўляюць:

1. Прапанаваць Віцебскаму Акругкому склікаць у бліжэйшы тэрмін аб'яднаны Пленум Акругкому і Акруговай Кантрольнай Камісіі, на якім заслухаць даклад камісіі ЦК і паставіць пытаньне аб такіх зьменах у складзе Бюро Акругкому, каб было забясьпечана ў поўнай меры правядзеньне ўнутры-партыйнай дэмакратыі, палашэньне кіраўніцтва работай прафсаюзаў, саветаў і масавай работай партыі сярод рабочых і селянства, а таксама, каб была забясьпечана дружная і калектыўная работа Акругкому і ўсёй партыйнай арганізацыі.

2. Прапанаваць Віцебскаму Акругкому прыняць рашучыя меры да палашэньня савецкага, прафсыянальнага і гаспадарчага апаратаў.

3. Прапанаваць Віцебскаму Акругкому разабраць усе заявы, пададзеныя ў камісію ЦК і ЦКК і перададзеныя камісіяй у АК і АКК, у двухтыдневы тэрмін паведаміць подавальнікаў заяў аб прынятых Акругкомам, па заявах, мерах.

4. Прапанаваць Акругкому зараз-жа прыступіць да правядзеньня ў жыцьцё ўсіх прапаноў, унесеных рабочымі на сходах, праведзеных пры ўдзеле камісіі ЦК і ЦКК, а ў выпадку немагчымасьці выкананьня асобных прапаноў, далажыць аб гэтым адпаведным рабочым сходам.

5. Разам з тым Бюро ЦК і Прэзыдыум ЦКК абавязваюць АК, РК бюро ячэек, АКК і ўсе фракцыі савецкіх, прафсаюзных і іншых органаў прыняць самы актыўны ўдзел у разгортваньні рабочай самакрытыкі, а АК і АКК навесьці рашучую барацьбу супроць скажэньняў самакрытыкі, супроць бюракратызму ў партыйным, савецкім, прафсаюзным і гаспадарчым апаратах.

ГОРАЦКІЯ БУДНІ.

Купляем—будуем.

Акадэмія будуе новыя будынкі, будавала яна і летась. Калі будуюцца, патрэбен лесаматар'ял, трэба яго закупіць. Хто можа быць больш падзейным, чым дзяржаўныя арганізацыя, як калінінскі камбінат. Ад такой арганізацыі можна гэты матар'ял і неагледаючы прыняць. Так і зрабілі, але ўсё-ж такі рашылі хоць для формы акт скласьці, і рабочыя закрычалі, што матар'ял дрэнны.

Па дагавору ад 29-VII 27 г. камбінат абавязваўся даставіць дошкі 1-га сорту па цане 1 р. 08 к., за куб. фут. І вось паступіў матар'ял. Аказалася, што ня 1-га, а 2-га і 3-га сорту. Склікалі камісію і агляд вытварылі па тэрыторыі Акадэміі. У другі раз таксама былі дошкі нават зусім нягодныя, аб чым склалі акты. Акты да справы. Калінінскаму камбінату заплацілі як за 1-шы сорт. Убачыўшы нарошце, што дрэнна зрабілі, склалі новую камісію для разгляду 2-х актаў і камісія знайшла, што камбінат парушыў дагавор (камісія пісала акт 24-II 28 г.) г. зн. праз шасьць месяцаў пасьля атрыманьня дошчак. У выніку—акадэміі страта на 1076 р. 14 к.

Пасылі прадстаўніка ў камбінат. Камбінат выставіў Акадэміі камбінацыю і праў.

Чаго вы спалі да гэтага часу паважаныя гаварыты, гаспадары і купцы...

Зноў купляем.

Акадэмія рашыла апальваць сваё памяшканьне торпам—добрая рэч. Трэба закупіць торфмашыны. Узяў на сябе гэту справу ректар Акадэміі Козыраў (юрыст па асьвеце). Паехаў і купіў. Прыбыла ў Акадэмію 21 чэрвеня 1927 году адна частка, а 8-га кінуўна таго-ж году другая частка. Машыны зьвезьлі ў кучу і 30 лістапада склалі камісію для агляду машын. Камісія надта аўтарытэтная—прафэсар-асыстант і тэхнік, але-ж яны сказалі: „машыны закіданы ў складзе другімі рэчамі, ня ручаемся за іх наўпаку і пэлясьць, трэба злажыць машыну, тады судзем ведаць ці ўсе часткі". Акт та належаньні ў Праўленьне Акадэміі. Праўленьне „ні адказу ні прыказу"—вады ў рот набрала.

Да торфараспрацовак 12 вёрст. Трэба ехаць, трэба весьці машыны. Простая штука акадэмічным працаўнікам перавезьці машыну, асабліва каменданту Акадэміі Шпачынскаму—узяў і павёз. У выніку палёў кожух машыны. Прывезьлі, злажылі. Але... ня ідзе ніяк машына—не падыходзяць часткі адна да другой. Пехаце частак. У завод. Завод адзін чарнёж, другі, а яны ня сходзяцца. Давай дарабляць часткі, давай ставіць шківы новыя і г. д. Пусьцілі ў ход, а 16-га машына, прайшоўшы 4 дні, паламалася. А рамонт каштуе добрых пару сотен. Заміж сваячасовага пачатку працы прыступілі каля сярэдзіны чэрвеня і то рамонт машыны ня скончылі, не хапае яшчэ шківа к прэсу.

Ахова працы на торфа-распрацоўках.

На што нормы вырабаткі, на што стаўкі, калі торфмайстра Шчарбакоў сам «дагаворыцца» пытаюць рабочыя аб умовах, а ён у адказ—вечарам дыгаворымся.

Кінчонай вады па думцы Шчарбакова рабочыя ня будуць піць, чаму на месцы працы не ня было. Прыехала камісія для агляду машыны і працы.

Сядзіць работніца, пасекла нагу, а ні ёду, ні бінту перазавязаць няма чым.

Будуем так сабе—па-хатняму.

Чэрвень месяц. Будаўніцтва павінна быць у Акадэміі на поўным ходу. А тут ні каштарысаў, ні плянаў будаўніцтва. Есьць маленькі плянік, зроблены ў прысутнасьці Нам. Наркамасьветы т. Валасевіча, але яго ня прытрымліваюцца.

За будаўнічыя грошы купілі дроў на 4661 руб. замяж заказу тэхніка—500 пуд. цэменту. Пшачынскаму (гэндзі раней, ён на ўсе рукі майстра) купляе 1000 пудоў.

Цэглы ў свой час у аршанскім камбіна не ня купілі, а цяпер сваю цэглу робяць, і нават ад дажджу ня прыкрылі. Яны робяць, грошы траціць, а цэгла зноў у гліну плыве.

Каапэруем і гандлюем.

У Горках ёсьць пчалярнае т-ва, здаецца так і трэба—трэба разьвіваць пчалярную справу. Але-ж адна бяда, што ў нашым пчалярным таварыстве заняліся ня тым, чым трэба. Гандлюем сельска-гаспадарчымі прыладамі, гандлюем пукеркамі і нават гнілой воблай. Гандлявалі яблычкамі і прагандзіравалі 621 руб.

Расьлісвае сваю дзейнасьць старшыня Ліксуноў.—Пайшчыкаў 99, пайвога капіталу 321 руб. Растрат трохі маем. Але я ўсё зрабіў.

Слова мае старшыня рэвізыйнай камісіі т. Казлоўскі.

Мала пэнсіі.

Быць старшынёй с-г. крэдытнага т-ва ў Горках і атрымоўваць усяго 100 руб. у месяц, хоць там і не па каштарысу, але-ж гэта мала, ды яшчэ каму? Сафранкову. Ён ставіць пытаньне—дабаўце пэнсіі, альбо другога працаўніка, а кантрольны савет знайшоў, што калі другога ўзяць—80 руб. трэба плаціць. Лепш Сафранкову дабавіць 40 руб. і ён адзін за двух вывезе. Сафранкоў за 5 месяцаў бярэ зразу 200 руб. і працуе.

Працуе там бухгальтар Суздалаў. Кажуць, што ён дваюрадны брат Сафранкова. Яшчэ гэта добра невядома. Атрымоўвае 100 руб. і жыве дарма ў кватэры т-ва. Сафранкоў маўчыць, бо свой чалавек.

Прагандляваўся.

Ёсьць у нас у Горках беспрацоўныя. Трэба іх аб'яднаць. Аб'ядналі, зрабілі працкалектыў. Бярыла—упаўнаважаны, а Тарасаў—рахункавод. «Таргавалі як хацелі: у пчалярным т-ве гнілая вобла, яе ў працкалектыў—там прадаўць. Трэба прадаць пшанічную муку, можна зрабіць налажэньне 100-150 проц., а па некаторых таварах 300 проц. На што Бярылу рабіць распаўнкі, кожны пругнаны крамы сам зробіць. У выніку няма грошай 1307 руб. 45 кап., а ўсяго тавару ўва ўсіх крамах—на 2000 руб лёў.

„Усе арцельна".

Арганізацыя каапэратываў—рэч добрая, але-ж прымазваюцца падчас да каапэрацыі такія элементы, як Волаў з Горак, якія каапэрацыю скарыстоўваюць у сваіх мэтах. Вось Волаў і арганізаваў арцель у Цімохаўцы па лесараспрацоўцы. Якая-ж гэта арцель?

Рабочых наймаюць і плацяць, як каму хочуць—адному 1 руб. у дзень, а другому—75 кап. У ліку пайшчыкаў знаходзяцца «мёртвыя душы», якія ніякіх узносаў ня ўносілі; лесаматар'ял купляюць у акаляючага селянства, а колькі плацяць, дык гэта ведае толькі адзін Волаў, а больш мусіць ніхто. Сам Волаў сабе выплачвае ў месяц 100 руб.

Існуе арцель з 23 сьнежня 1926 году і ніхто нават і рэвізіі не зрабіў. Ніхто добра не паглядзеў, што там робіцца. А там за «іншыя выдаткі» чаёк напіваюць з прыяжджаючымі прадстаўнікамі і прыватнымі асобамі за пакупкай. За сем месяцаў на камандзіровачныя і іншыя выдаткі страчана 1053 руб

Трэба ў гэту арцель каму належыць заглянуць.

Мы самі сабе начальства.

На ст. Горкі Зах. чыг. ёсьць дарожны майстра. Ён сам сабе начальнік. Ні з кім ня лічыцца, асабліва калі стаіць пытаньне аб сваім чалавеку.

Ёсьць у Горках Таптуноў Лейба—можна ў яго выпіць і закусіць. Чаму ня ўзяць на крапу? Упаўнаважаны інспэкцыі працы піша зьвяз, бо ня сябра саюзу, а ёсьць сябры саюзу, якія атрымоўваюць пэнсію з страхкасы. «Ня веру, бяз пячаткі»—кажа майстра.

Прапануюць яму рабочых узяць праз корыф арматарскі пункт.—„Я вам прышлю сьп с, а вы іх праўдзеце—вось што кажа майстра.

А за выпіўкай, калі ласка, застанеце вы яго ў любы час дня і ночы ў Міндзіна, у кладоўцы на чыгунцы; наогул дзе хочацца, там і выпіў.

Яўрэі слабыя, кіпятку рабочыя ня п'юць.

Будуюць у Горках новы мост на станцыі Зах. чыгункі. Працуе каля 500 чалавек рабочых. Захацела адміністрацыя паказаць свой твар—антысэмітаў. Яўрэі, вы слабыя, ідзеце 9 чалавек асобна працуйце, пакажыце, што вы варты.—Гэта перад масай сялянства.

Бакі стаяць, іх даслалі. Але рабочыя кіпятку ня п'юць. Могуць піць толькі Ізоталў і Хмуровіч (прараб і дзесятнік), стаіць адзін чан.

Прыехалі прадстаўнікі РПБ і пракуратуры, дык і бакі сталі і рабочыя кіпяток навучыліся піць.

Выпіў—трэба пагуляць.

Так падумаў і зрабіў старшыня саюзу савгандлькслужачых Сільчанка. Паехаў у савгас Ленінва, падвыпіў, а потым ведае, што ў яго аднай знаёмай пайшоў муж у тэрабор,—рашыў пайсьці пагуляць. А першай гадзіне ночы пастукаў у дзьверы. Ня пускае. Выстраліў. Шум, гоман. Зьбегліся рабочыя,—ага, гэта, кажа, „прадстаўнік в райёну".

Усе гэтыя людзі павінны стаць перад пралетарскім судом—супроць іх вядзе сьледства пракуратура.

Але адной справы мала, трэба каб іх асудзіла савецкая грамадзкасьць.

Вартавы.

ХРОНІКА.

У Прэзыдыуме Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пры ЦВК БССР.

281 палявых ясьляў па БССР.

На апошнім пасяджэньні прэзыдыуму Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі быў заслуханы даклад Нар. Кам. Аховы Здароўя аб летняй ясельнай кампаніі.

З дакладу выявілася, што сёлета будзе існаваць 281 палявыя ясьлі, якія змогуць ахапіць звыш 7.000 дзяцей.

З гэтай колькасьці 205 будзе утрымлівацца на сродкі дзяржавы і 76 на сродкі грамадзкіх арганізацый і насельніцтва.

Прэзыдыум, заслухаўшы даклад, запрапанаваў акруговым дзіцячым камісіям не паслабляць увагі да гэтай галіны працы і адпусьціць неабходныя сродкі на летнюю ясельную кампанію.

Сродкі на рамонт памяшканьня вытворчых майстэрняў.

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пастанавіў адпусьціць 438 руб. на рамонт памяшканьня пад інтэрнат у вытворчых майстэрнях г. Менску.

Зараз у гэтых вытворчых майстэрнях знаходзяцца 130 бясспрытульных дзяцей.

Рамонт інтэрнату дасьць магчымасьць прыняць у гэтыя майстэрні яшчэ 15-20 дзяцей.

Месячнік дапамогі бясспрытульным дзецям.

Згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК і СНК БССР у ліпені месяцы пачне праводзіцца месячнік дапамогі бясспрытульным дзецям.

Ужо вылучана камісія, у якую ўваходзяць прадстаўнікі ад камсамольскіх, прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый для правядзеньня ўсёй падрыхтоўчай работы, зьвязанай з месячнікам.

1000 руб. на ўтрыманьне дзіцячага ачагу.

Прэзыдыум Цэнтральнай Дзіцячай Камісіі пастанавіў адпусьціць Менскаму таварыству «Прыхільнік Дзяцей» 1000 руб. на ўтрыманьне дзіцячага ачагу, які знаходзіцца ў Менску.

У гэтым ачагу зараз знаходзіцца 40 дзяцей.

Прызначэньне новага прафэсара.

Праўленьне Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту пастанавіла прызначыць дацэнта пэдфаку на катэдры літаратуры тав. Барычэўскага прафэсарам па катэдры тэорыі літаратуры.

Гэта прызначэньне прадстаўлена зараз на зацьверджаньне Нар. Кам. Асьветы.

Новая катэдра на мэдфаку БДУ.

З будучага навучальнага году пры Беларускім Дзяржаўным Унівэрсытэце адчыняецца новая катэдра патолёгічнай фізіолёгіі.

Праўленьне Унівэрсытэту прызначыла на гэтую катэдру прафэсара па катэдры патолёгічнай фізіёлёгіі Казанскага Вэтэрынарнага Інстытуту і Унівэрсытэту Н. В. Колпікава.

Прэмія за навуковую працу.

Экспэртная камісія Цэнтральнага камітэту па палепшаньні быту вучоных (Масква) сумесна з цэнтральным бюро сэкцыі навуковых працаўнікоў РСФСР разгледзела навуковыя працы („Методологическое введение в науку и философию" том 1-й и „Опыт истории ассоциационизма") быш. прафэсара БДУ Іваноўскага, які зараз атрымоўвае пэрсанальную пэнсію. Злучная камісія пастанавіла прэміраваць гэтыя навуковыя працы ў разьмеры 300 руб.

Падрыхтоўка настаўнікаў для школ нацменшасьцяў.

Падрыхтоўка настаўнікаў для літоўскіх школ з наступнага году будзе весьціся пры Менскім Беларускім пэдтэхнікуме, пры якім мяркуецца адчыніць літоўскую групу на 10 чалавек.

Для латыскіх школ БССР настаўнікі будуць рыхтавацца ў Ленінградскім Латыскім Пэдтэхнікуме. Для гэтай мэты Наркамасьветы мяркуе вызначыць некалькі стыпэндыяў.

Новыя вопытна-практыкавальныя школы пры пэдтэхнікумах.

Для практычных заняткаў студэнтаў пэдтэхнікумаў Наркамасьветы мяркуе з наступнага вучэбнага году пры апошніх адчыніць 4-хгадовыя вопытна-практыкавальныя школы Сёлета мяркуецца адчыніць 5 такіх школ: у Воршы, Чырвоным Берагу, Мазыры і 2 у Гомелі. Такія школы ўжо існуюць пры гомельскіх пэдтэхнікумах і ўтрымоўваюцца яны на пасёлковым бюджэце. З наступнага году гэтыя школы будуць узяты на дзяржаўны бюджэт.

Выезд кіно-экспэдыцыі ў Мазыршчыну.

Сёньня, 26-га чэрвеня, выяжджае ў Мазыршчыну кіно-экспэдыцыя Белдзяржкіно ў складзе кансультанта тав. Ляжнеціча і фото-апэратара тав. Салавейчыка для правядзеньня здымкаў і работы да пастаноўкі карціны «Песьня вясны», на аповесьці Якуба Коласа «На прасторах жыцьця». Адначасова распачаты работы да пастаноўкі карціны «Атамая Муха» па сцэнарыю Анатоля Вольнага.

Апэрэта з Казані.

На гэтых днях у Менск з Казані прыяжджае апэрэта пад кіраўніцтвам тав. Мірскага.

Апэрэта паставіць наступныя п'есы:

1) Клоўн; 2) Жаніхі; 3) Чорны амулет; 4) Танец стракоз і 5) Азэліта.

Першыя гастролі пачнуцца 28 чэрвеня.

Дадатковы крэдыт на перасеў ярыны.

Праўленьне Белсельбанку дадаткова адпусьціла Віцебскае, Аршанскае і Гомельскае 27.000 руб. крэдыту спэцыяльна на перасеў ярыны. Разам з тым запрапанавана Віцебскаму, Магілеўскаму, Полацкаму і Бабруйскаму акруговым сельска-гаспадарчым крэдытным таварыствам выдзеліць на кватаваньне перасеву ярыны частку з сваіх сродкаў.

Менскі дзень.

Будынак, які зараз займае Цэнтральны Дом Селяніна, Гарсавет пастанавіў перадаць для патрэб Інстытуту Беларускай Культуры.

25000 руб. крэдыту адпусьціў Белсельбанк Белсельтрэсту. Гэтыя грошы выданы на разьвіньне пладаводзтва ў савецкіх гаспадарках Белсельтрэсту.

Пабудаваць 6 сялядаў, 13 магазынаў і 47 ларкоў мяркуе ў наступным годзе па розных гарадох БССР Белрабсакцыя. Усё гэта будаўніцтва будзе каштаваць 724700 руб.

Сёлета ў працкалектывы БССР будзе ўцягнута 2815 бесспрацоўных. За першае паўгодзьдзе бягучага году ўжо дадзена работа 2320 беспрацоўным.

46000 руб. паявых узносаў мяркуе сабраць у чэрвені месяцы Менскі ЦРК. Па ходу кампаніі можна спадзявацца, што гэта лічба будзе сабрана поўнасьцю.

Тыраж выйгрышаў пазыкі 1922 году.

Першага ліпеня пачнецца тыраж выйгрышаў пазыкі 1922 году. Сярод іншых выйгрышаў будзе разыграны адзін выйгрыш у 100.000 руб., два па 50.000 руб., тры па 25.000 руб. і шараг іншых.

300.000 руб. на ўзмацненьне сельска-гасп. каапэрацыі.

Савет Белсельбанку даручыў праўленьню апошняга набыць паёў акрсельбанкаў на 300.000 руб. Гэта мерапрыёмства праводзіцца выключна для ўзмацненьня фінансавага становішча сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі.

Дубровенская фабрыка выпусьціць 4.187.000 мэтраў мануфактуры.

Дубровенская мануфактурная фабрыка сёлета выпусьціць прадукцыі, працуючы ў 2 зьмены, 4.187.000 мэтраў бавоўнянай мануфактуры. Сабекошт мануфактуры фабрыцы абыдзецца ў 2.190.000 руб. Рэалізацыя ўсёй вытворчасьці фабрыкі будзе праводзіцца праз спажывецкую кааперацыю БССР.

Вытворчасьць дубовага паркету.

Пры апрацоўцы дубу атрымоўваецца некаторы прапант адходу, які можа быць скарыстаны для вытворчасьці паркету. ВСНГ БССР у наступным годзе мяркуе пераабсталяваць гомельскі завод «Сацыялізм» пад вытворчасьць паркету і павонкіх капылоў. Пераабсталяваньне мяркуецца скончаць у наступным годзе і яно будзе каштаваць каля 200.000 руб.

2.000 рабочых заняты на будаўнічых работах.

У сучасны момант на будаўнічых работах у Менску занята каля 2.000 рабочых.

Па пляну-ж павінна было быць занята ня менш 3.500—4.000 рабочых. У большасьці рабочыя заняты ў 4 будаўнічых арганізацыях: Белдзяржстрой, Белжылсаюз, Ваенпед і «Торгстрой».

Новае праўленьне Менскага добраахвотна-пажарнага т-ва.

25-га чэрвеня адбыўся агульны сход дружыньнікаў менскага добраахвотна-пажарнага т-ва, на якім выбрана новае праўленьне ў складзе 13 чал.

У новае праўленьне абраны наступныя таварышы: Кроль (старшыня), Г. Шапіра (нам. старшыні), Шчадько, Відосаў, к-р М. Шапіра.

Адказным сакратаром абраны т. Марголін. З усіх абраных 7 рабочых.

Пашырэньне дыэтычнай сталоўкі.

З 1-га ліпеня зачыняецца на месяц менская дыэтычная сталоўка. Пасьля гэтага дыэтычную сталоўку мяркуюць пераевесьці ў будынак цэнтральнай рабочай амбулаторыі, для чаго будзе адведзен 2-гі паверх гэтага будынку.

У новым памяшканьні сталоўкі будзе абсталяваны душ, наладжана дыспансэрызацыя хворых і інш.

НОВЫЯ КНІГІ.

Вышлі з друку і паступілі ў рэдакцыю газ. „Савецкая Беларусь" для рэцэнзіі наступныя книжкі:

1. „Паляўнічы Беларусі" № 3. Стар. 35, цана 30 кап. Выданьне Беларускага Прамыслова - Каапэрацыйнага Саюзу Паляўнічых.

2. „Плуг" № 6 Стар. 40, цана 20 кап. Выданьне Народнага Камісарыяту Земляробства БССР. Менск.

3. „Маладняк" № 6. Стар. 127, цана 60 кап. Штомесячная літаратурна-мастацкая, грамадзка-палітычная часопісь. Выданьне ЦК ЛКСМБ «Чырвоная Зьмена».

СУД.

„Плешчаніцкі гнойнік".

30 чэрвеня 1928 г. выязная сэсія Менскага Акруговага Суду ў м. Плешчаніцах пад старшынствам т. Жылінскага з удзелам Пракурора Судакова і абаронцы Краўзэ распачнецца слуханьнем справы былых служачых Плешчаніцкага РВК, якія абвінавачваюцца ў злоўжываньнях на службе, сыстэматычных п'янствах і іншых агідных і брудных дзеяньнях.

Да адказнасьці прыцягнута 8 асоб. Старшыня РВК Трахімаў стаіць на чале, а за ім ідуць члены РВК: Казлоў, Адамовіч, Шостак, Падляшук, Гусеў, фінінспэктар Веранёў і акруговы інспэктар лясоў Сташан. Усе члены партыі.

Як апавядае абвінавачальны акт Плешчаніцкі гнойнік заснаваўся ня так даўно, але за кароткі тэрмін гной расваўсюдзіўся і цёплая кампанія дзейнічала ня толькі ў цэнтры райёну, але і ў вёсках, хутарох і іншых мясцох Плешчаніцкага райёну.

Папершае, як Трахімаў, так і эстатнія падсудныя сыстэматычна п'янствавалі, зьлучаліся на службу п'янымі, хадзілі ў мясцы Плешчаніцах і вёсках п'янымі, падымалі бяз прычыны страляніну, затрымоўвалі сялян і пастаўніц, прыставалі да іх з каханьнем і прапановамі ўступіць у палавыя зносіны. Былі выпадкі, калі з габінэту старшыні Трахімава—разьбіваліся ў час заняткаў пастаўніцы праз вокны. Шостак ноччу праз акно залазіў да сялянкі Валуй з мэтай яе зґвалціць. Веранёў п'яны вандраваў па вёсцы ў адным боце і сяляне сьміяліся над ім.

Трахімаў, скарыстаўшы сваё службовае становішча, прымусіў загадчыцу ясьлямі Шостак, былую ў службовай залежнасьці ад яго, уступіць з ім у палавыя зносіны супроць яе волі і жаданьня. Былі здарэньні, калі інспэктар Сташану нападала ад пастаўніцы на твары за «каханьне». Акрамя гэтага, Гусеў зрабіў растрату будаўнічых авансаў—539 руб., а Трахімаў, Казлоў, Падляшук і Адамовіч на папярэдняй зводзе прадалі сырабойню, але грошы прыкішэнілі.

Па справе выклікаецца 56 сьведак сялян. Разгляд справы працягнецца некалькі дзён у Народным Доме.

Кастроў.

Добрая швагерка.

Селянін Мсьціслаўскага райёну Арцанскае акругі Курачкін нашоў у Чырвоную армію, а дома засталіся гаспадарыць яго жонка Алеся і пасьнадцацігадовы брат Пілія. Апошні, адчуваючы сябе раўнаправным, перашкаджаў швагерцы кіраваць гаспадаркаю. На гэтай глебе паміж імі бывалі часта сваркі. І вось, 18-га лютага бягучага году, карыстаючыся тым, што ў хаце нікога ня было, Алеся схапіла хлапца за горла і задушыла. А каб пазбавіцца кары за сваё злачынства, зацягнулаахвяру пад павець і павесіла на бэльцы, прыдаўшы такім чынам выгляд самагубства, аб чым заявіла ўхадзе. Але ад ускрыцьця трупу—з аднаго боку, усе акалічнасьці справы—з другога і ў дадатак прызнаньне самой Алесі, прывялі яе на лаўку падсудных па абвінавачаньні ў забойстве з карыснаю мэтаю і пры тым спосабам асабліва пакутным.

Арцанскі акруговы суд прытаварыў жанчыну-забойцу на 8 гадоў зьняволеньня з суровым адмежаваньнем і пазбаўленьнем правоў на тры гады, але, прымаючы пад увагу яе першую судзімасьць і цемнату, кару гэтую скараціў да 5-ці гадоў.

Вярхоўны Суд прыгавар гэты заацьвердзіў, а касацыйную скаргу асуджанай—адхіліў.

Шуляк.

ТЭАТР—КІНО.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА».	Грандыёзны мастацкі фільм па раману Фэрдынанда Дюшэна „Прокаженная". Пачатак а 8 гадзіне.
КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА".	З аўторка, 26 чэрвеня нямецкі баявік „Жонка статс-сэкратара" Ў 8 частках. Пачатак а 7 гадз. 15 хвілін.
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	„Кар'ера танцоркі" з удзелам Пат і Паташона.
КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ».	З аўторка 26 чэрвеня „СЫНАБАР" 3-я апошняя серыя. Пачатак а 7 гадзіне.

Апавяшчэньні.

У сераду 27 чэрвеня, а 6 з паловай гадзіне ўвечары ў клюбе савгандслужачых адбудзецца СХОД ГАРАДЗКОГА ПАРТАКТЫВУ МЕНСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ па пытаньні «ПРАЭКТ ПАБУДОВЫ ТРАМВАЮ Ў МЕНСКУ».

Члены ЦК, ЦКК, АК, АКК, Бюро ЦК і АК КСМ уваходзяць па сваіх мандатах, астатнія атрымліваюць білеты па райкомах КПБ.

МЕНАКРУГКОМ КПБ.

Нарада партпрымацаваных да камсамольскіх яч., назначаная на 23-VI у клюбе КІМ (Камсамольская вул.), адбудзецца ў сераду 27-VI а 7 гадзіне ў тым-жа памяшканьні.

АК КПБ.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

27-е а 8 гадзіне ўвечары адбудзецца пасяджэньне гаспадарчае камісіі ШЭФ-Т-ВА „ПРАЦАСЬВЕТЫ".

На парадку дня:

1. Аб арганізацыі дзіцачае пляцоўкі ў падшэфным с-с.
2. Аб працы на летні час.

Прысутнасьць сяброў гаспадарчае камісіі і ўсіх упаўнаважаных пры ўстановах АБАВЯЗКОВА. Усім ГРУПКОМАМ і МЯСЦКОМАМ неабходна вылучыць сваіх прадстаўнікоў.

У сераду 27 чэрвеня г. г. а 7 гадзіне ўвечары адбудзецца чарговы дэлегацкі сход Гарраёну ўсіх трох груп.

Ёўка дэлегатак абавязкова.

Гаррайком КП(б)Б.

Абавязковая пастанова № 11

Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту

25 чэрвеня, 1928 году.

Менскі Акруговы Выканаўчы Камітэт пастанаўляе:

Адмяніць абавязковую пастанову сваю № 3 ад 10-га студзеня 1928 г. (апубл. у газэце „Савецкая Беларусь" № 12—1928 г.) аб устанаўленьні грашовай формы расплаты за памол сялянскага зярна на млынох і крупадзёрках прыватных асоб.

Старшыня Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту ЯЦКЕВІЧ.

Сэкратар Акруговага Выканаўчага Камітэту КАРАНЕЎСКІ.

АУТОБУС № 13.

— Як яго перахітрыць? Пайсьці ў гараж, ці што?

— Пойдзем. Толькі ці пусьціць там сесьці?

— Пусьцяць. Заўсёды пускаў.

І партыя камсамольцаў пайшла да гаражу менскага аўтакіраўніцтва. Аўтобус выйшаў. Шофэр крыкнуў:

— На пляц Волі! Ніхто тут ня сядзе!

Камсамольцы закінулі клункі за плечы і праз увесь горад пачасалі на пляц Волі.

Другая партыя пасажыраў рашыла злавіць аўтобус № 13 каля пошты, куды ён меў прыйсьці.

— Прыдзе, нікуды ня дзенецца.

— А мо' проста на пляц Волі пойдзе, што тады будзе? Прапалі мы тады.

— Прыдзе, пошту-ж абавязкова трэба забраць. Пачакаем.

Прайшло 15 хвалін. Прайшло паўгадзіны. Мінула гадзіна. Аўтобус паказаўся.

Партыя пасажыраў, якая чакала каля пошты, нарыхтавала клункі. Шофэр яшчэ здалёку высунуў галаву ў вакно і крычыць:

— Ніводзін ня сядзе! Усе на пляц Волі!

Так заханіўся ён крыкам, што чуць селяніна не раздушыў.

— Што за ліха,—кажуць пасажыры,—то ён блрэ там, дзе ўздумае, а то—на пляц Волі.

На пляцу Волі, супроць будынку камгасу, пасажыраў было, прыблізна, на тры аўтобусы. Прыйшлі ад гаражу і ад пошты—яшчэ больш стала. Хто сядзіць у сквэры на лаўцы, хто на сваім клунку з прычыны адсутнасьці лаўкі, хто—проста падкурчыў ногі і сеў на зямлі, хто стаіць, а хто прылёг і сьпіць. Поўная ілюзія пасажырскай станцыі тыпу 1919 г.

— Уміг мне ўсе сядзеце,—разважаў прынцыповы шофэр.

Поўным ходам пад'ехаў і раптам затрымаў машыну.

Схапіваньня ад доўгага чаканьня пасажыры кінуліся ў атаку на аўтобус. Уміг напоўніўся аўтобус; трэснула ручка на дзьвярох машыны; нейкі дзядзька схапіўся за галаву, а бабка за набітую скабу. Хто плача, хто плача, хто аддыхаецца, а той, хто ўлез у аўтобус—здаволена сьмяецца.

У шофэра ўсё ў парадку. Што-ж яму рабіць? Засталося прадаць білеты і ехаць.

— Хто едзе да Баравой—можа выйсьці,—заявіў ён,—білетаў ня дам.

Для тых, хто ехаў да Баравой, гэта значыла: «Бярыце білеты не за 65 капеек, а за 1 р. 25 к. да Гарадка».

Так і было.

Паехалі.

На Шыракой вуліцы шофэр Круль шчыра пачухаў патыліцу і спыніў машыну. Вылез са сваёй будкі і сеў на сустрэчны аўтобус.

Розныя пайшлі гутаркі: адны казалі, што Круль забыўся разьвітацца з жонкаю, другія,—што ён не залатвіў справу, якую пры пасажырах ня можа залатвіць.

Праз паўгадзіны Круль усё-ж прыехаў. Усе абрадаваліся:—паедзем.

Ехалі добра, калі ня лічыць таго, што ў некаторых мясцох ішлі пехатой.

Так ня першы і не апошні раз.

Калі НК-РСІ ўздумае дапамагчы аўта-кіраўніцтву паладзіць кіраваньне яго справамі, дык астрашыцка-гарадзецкія пасажыры трымаюцца такога погляду:

— Ляпей было-б даць дадатковыя машыны, а калі нельга, дык трэба зьняць і гэту. Ляпей памалу, але з цэлымі скабамі і папоўна заехаць.

С. Азэрскі.

Беларускі насьценны каляндар перад 3-м сэзонам.

Каляндара няма—ёсьць толькі беларускі.

(Са звароту прыказчыка да пакупца).

Апошнімі днямі зьявілася ў газэтах некалькі заметак пра беларускі насьценны каляндар.

Адна з гэтых заметак, надрукаваная ў газэце „Зьвязда" за 26 чэрвеня і падпісаная А. Б., паміж іншым кажа: «БДВ ня ўлічыла рынку, дзякуючы чаму насьценны каляндар, надрукаваны ў ліку сто тысяч, не распрадаўся і ад гэтага БДВ навяло дзесяць тысяч рублёў страты; РСІ вынесла вымову праўленьню БДВ».

Ці сапраўды так стаіць справы, як аб іх інфармуе А. Б.?

У леташнім годзе БДВ распрадало ўвесь тыраж календару, якога аказаўся недахоп. На бягучы год тыраж падняці да ста тысяч. Ці-ж гэта многа на БССР? Зразумела, што ня многа, каб яго нармальна распаўсюджвалі тыя арганізацыі, якія прыхапаюць кнігу ў вёску (каапэрацыя, „Кніга-Вёсны" і інш